Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 219 (5052)
ВЕРАСНЯ
30
НЯДЗЕЛЯ
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Москва
Старая Площадь 4 ЦК ВКП(б) Орг.
Инстр. Отдел
на 1934 г.
Звезда—1

7-Й САМАРСКАЙ ЧЫРВОНАСЦЯЖНАЙ КАВАЛЕРЫЙСКАЙ ДЫВІЗІІ

У дзень 15-годдзя слаўнай 7-й Самарскай чырвонасцяжнай кавалерыйскай дывізіі прэзідыум ЦВК БССР шле камандна-палітычнаму і чырвонаармейскаму складу дывізіі гарачае прывітанне.

Совецкая Беларусь ганарыцца 7-й Самарскай дывізіяй, як надзейным абаронцам межаў Совецкага Саюза, актыўным удзельнікам Саюза, актыўным удзельнікам мірнага соцыялістычнага будаўніцтва БССР.

Няхай жыве 7-я Самарская чырвонасцяжная дывізія.
Няхай жыве ЦК ВКП(б) і наш любімы правадыр тав. Сталін!
Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯУКОЎ.

АБ АДЗІНАЧАСОВЫМ ПАДАТКУ НА АДНААСОБНЫЯ ГАСПАДАРКІ У 1934 ГОДЗЕ

Даходы калгаснай вёскі растуць з года ў год. У гэтым лёгка пераканацца, нават не звяртаючыся да спецыяльных статыстычных выкладак. Даволі глянуць, як павысілася пакупальная здольнасць совецкага селяніна. Ніколі яшчэ вёска не прад'яўляла такога павышанага попыту на прамысловыя тавары, і пры тым высокай якасці. Веласіпеды, аўтамашыны, будаўнічыя матэрыялы, грамафоны, люстры, металічныя ложкі, шаўковыя панчохі—на ўсё гэта ёсць цяпер попыт у вёсцы. Сяляне, спрадвеку насіўшыя лапці, патрабуюць хромавыя боты. Хіба трэба яшчэ больш пераканаўчых доказ росту даходнасці калгаснага сяла?!

Але расце не толькі даход калгаснікаў. Расце таксама і даход аднаасобнікаў. За апошнія 2-3 гады, у прыватнасці дзякуючы развіццю калгасных базараў, на якіх аднаасобнікі трымаюць сябе зусім не пасіўна, даходы аднаасобных гаспадарак узраслі вельмі значна.

Ці ўзрос у такой-жа ступені сельска-гаспадарчы падатак на аднаасобныя гаспадаркі? Не. Бясспрэчна, што ў параўнанні з ростам даходнасці памеры сельгаспадатку на аднаасобныя гаспадаркі з'яўляюцца нязначнымі.

Апрача таго, што частка, і прытым не малая частка даходаў аднаасобных гаспадарак не абкладаецца ў сілу закона (напрыклад, абкладаюцца толькі 30 проц. даходу ад ізвозу), некаторым аднаасобнікам, з прычыны слабай работы мясцовых фінансавых органаў, удаецца ўвільнуць ад абкладання.

Вось чаму зусім своечасовым з'яўляецца пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў СССР «Аб адзінаачасовым падатку на аднаасобныя сялянскія гаспадаркі ў 1934 годзе», апублікаваная ў «Правде» 27 верасня.

Можна прывесці нямала прыкладаў таго, як слаба і абсалютна непастаткова абкладзены аднаасобнікі. Вось аднаасобнік сяла Білошыц, Карасценьскага раёна, Кіеўскай вобласці, І. П. Абрамовіч. Ён мае каля трох га палявых, агарод, 0,3 га сенажосу, каня, карову, узве авечкі. Усяго даходу ў гэтага аднаасобніка, згодна яго-ж даных —2.108 руб. Плаціць сельгаспадатку 77 руб.—3,6 проц. ад даходу. Вось другі аднаасобнік сяла Баромля, Трасцянскага раёна, Харкаўскай вобласці, І. А. Васіленко. Гадавы даход—2.300 руб. Сельгаспадатак плоціць 90 руб.—4 проц. ад даходу.

Мы ўзялі гэтыя дзве гаспадаркі, зусім не выбіраючы, і аб размерах даходу меркавалі паводле слоў самых платнікаў падатку. Можна знайсці куды больш яркія прыклады. Але і з прыведзеных прыкладаў даволі ясна, наколькі адстае падатковае абкладанне аднаасобнікаў ад іх даходнасці.

Нямала і такіх аднаасобнікаў, якія ёмка скарыстоўваюць рынкавую кан'юнктуру, а то і проста спекулююць сваімі прадуктамі, атрымліваюць вялікія даходы, якія зусім астаюцца без абкладання ці абкладаюцца ў зусім мізэрных размерах. Вось, напрыклад, у сяле Грачоўка, Фролаўскага раёна, Сталінградскага края, ёсць дзве аднаасобныя гаспадаркі, якія маюць вялікія агароды і сады. Скарыстоўваючы рынкавыя ўмовы, яны ў перыяд паспявання маладой бульбы і фруктаў зарабляюць па 10-15 тыс. руб. у год. А колькі яны плацяць падатку? Не больш чым 300-300 руб.

Фінансавы апарат вёў яўна недастатковую работу па выяўленню ўсіх даходаў аднаасобнікаў. Дзеля таго-ж, што ўстанаўляць дакладны даход аднаасобных гаспадарак значна трудней, чым даход калгасаў, то нярэдка мясцовыя ўлады ішлі па лініі найменшага супраціўлення і недаабкладалі даходы аднаасобных гаспадарак.

Аднаасобныя гаспадаркі наогул даволі хутка прыстасоўваюцца да рынкавых і ўсякіх іншых кан'юнктурных умоў. Мяняецца самы тып аднаасобнай гаспадаркі. Іншы аднаасобнік на ізвозе зарабляе значна больш, чым ён атрымлівае ад палявой гаспадаркі. І такіх аднаасобнікаў нямала. Але абкладаюцца толькі 30 проц. атрыманага імі даходу ад ізвозу, які, як правіла, улічваецца далёка не поўна.

Такім чынам, адзінаачасовы падатак на аднаасобныя сялянскія гаспадаркі ў 1934 г., устаноўлены ЦВК і Соўнаркомам СССР, з'яўляецца неабходным дадаткам да існуючага сельгаспадатку.

Няма патрэбы пераказваць тут змест пастановы ЦВК і Соўнаркома СССР. Напомнім толькі 2 пункты гэтай пастановы. Па-першае:

«Гаспадаркі, якія злосна не выконваюць заданых ім планаў па сяўбе і абавязковых паставак сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве, абкладаюцца адзінаачасовым падаткам на агульных асновах, але сума падатку на іх падвышаецца».

Гэта вельмі істотны пункт. Аднаасобнікі, якія не выконваюць скажам, зернапаставак, караюцца пэўным законам, але, паміма гэтага, яны павінны плаціць падвойную стаўку адзінаачасовага падатку, бо яны паспелі збыць свой хлеб па спекулятыўных цэнах. Совецкая дзяржава адносіцца з вялікарнай увагай к патрэбам сялянства, але яна патрабуе і ад аднаасобнікаў чэсных адносін да совецкіх законаў. Калі аднаасобнік, у пагоні за спекулятыўнымі даходамі не выканаў свайго абавязацельства, то паміма таго, што ён не вызваляецца ад зернапаставак, ён плаціць падвойную стаўку падатку.

Другое, што неабходна напомніць—гэта тэрміны ўплаты падатку, устаноўленыя пастановай урада. 50 проц. усёй сумы падатку павінна паступіць не пазней 15 лістапада, і ўвесь падатак—не пазней 15 снежня 1934 года. Для ўплаты адзінаачасовага падатку кулацкімі гаспадаркамі ўстанаўляецца адзін тэрмін, і прытым не пазней 15 лістапада.

Тэрмін зусім дастатковы для поўнага і безагаворачнага збору ўсяго падатку. Ніякіх паблажак і адтэрміновак не павінна быць. Трэба шырока растлумачыць гэту пастанову вёсцы. Але адным растлумачэннем справа не павінна абмежавацца. Да тых, хто папрабуе ўвільнуць ад падатку або зацягнуць тэрміны яго ўплаты, павінны быць прыменены ўсе меры, прадугледжаныя законам.

Той факт, што аднаасобныя гаспадаркі ў цэлым у нас недаабкладзены, што значная частка даходаў аднаасобнікаў выслізгае ад падатку, тлумачыцца, як мы ўжо ўказвалі, таксама недастаткова чоткай работай фінансавага апарата. Устанаўленне размераў даходнасці перадаваўцца часта безадказным людзям. Раённыя выканаўчыя камітэты абавязаны прасачыць, каб гэтага не паўтарылася зараз. Адзінаачасовы падатак павінен быць сабран поўнасцю і своечасова. (Перадавы артыкул «Правды»).

КРАМАТОРСКІ ГІГАНТ УСТУПІЎ У СТРОЙ

МІТЫНГ У КРАМАТОРСКУ

КРАМАТОРСК, 28 верасня. (БЕЛТА). У 8.30 мін. раніцы да Краматорскага вакзала падыходзіць поезд, а якім прыбывае т. Орджанікідзе. На вакзале наркома цяжкай прамысловасці сустракаюць тт. Шэлехес, Саркісаў, Вайнаў, старшыня абвыканкома Іваноў, сакратар Краматорскага горпарткома Просвірнін, дырэктар завода Кірылкін і іншыя, прадстаўнікі данецкіх і краматорскіх арганізацый. Да пачатку ўрачыстага мітынга, прысвечанага пуску цэхаў першай чаргі, т. Орджанікідзе ў суправаджэнні т. Кагановіча, Шэлехеса, Саркісава, Вайнава, Кірылкіна, Просвірніна і іншых аглядаў рад цэхаў Краматорскага завода. У цэхах—узорны парадак, чыстата. К 11 гадзінам тт. Орджанікідзе, Каганавіч, Шэлехес, Саркісаў, Вайнаў, Кірылкін, Просвірнін, прадстаўнікі данецкіх арганізацый і госці займаюць месцы на пускавой трыбуне, над якой развіваюцца палотнішчы і сцягі. Пускавая плошча запоўнена дэлегацыямі рабочых металургічнага старога і новага машынабудаўнічых заводаў і гасцямі. На плошчы каля 20 тыс. працоўных. З'яўленне т. Орджанікідзе выклікае гул апладысментаў, крыкі «ура» кіраўніку цяжкай прамысловасці тав. Орджанікідзе.

Мітынг, прысвечаны ўрачыстаму пуску 13 цэхаў, адкрывае старшыня заўкома завода імя Сталіна т. Гранкін.

Першае слова для рапарта аб гатоўнасці першай чаргі Краматорскага завода цяжкага машынабудаўніцтва імя Сталіна прадастаўляецца дырэктару завода т. Кірылкіну.

Тав. Кірылкін запэўняе ў асобе т. Орджанікідзе партыю і ўрад, што таксама дружна з такой-жа напружанасцю і энергіяй, з якой многатысячны калектыў і яго кіраўніцтва працавалі над увядзеннем у строй завода імя Сталіна, яны выканаюць задачы, пастаўленыя перад імі ў справе асваення яго вытворчай магутнасці, і імя правадыра партыі завод апраўдае.

Тав. Кірылкін зачытвае пускавы рапарт на імя тт. Сталіна, Кагановіча, Молатава, Касіора, Постышэва, Любчэнко.

Апошнія словы рапарта пакрываюцца громам апладысментаў.

З прывітаннямі выступілі таксама нач. будаўніцтва т. Кронаў, інжынер Копп і лепшыя ўдарнікі будаўніцтва.



Краматорскі завод імя Сталіна. Агульны выгляд столеліцейнага цэха.

ПРАМОВА тав. ОРДЖАНІКІДЗЕ ПРЫ АДКРЫЦЦІ КРАМАТОРСКАГА ЗАВОДА

Таварышы, Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Камуністычнай партыі (большэвікоў) і Совет Народных Камісараў Саюза даручылі мне перадаць вам, будаўнікам, эксплаатацыйнікам, ударнікам і ўдарніцам, інжынерам і тэхнікам, т. т. Кірылкіну, Просвірніну і Гранкіну, гаспадарнікам — гарачае прывітанне (бурныя апладысменты).

Наш друк ужо адзначыў велізарнае значэнне пуску першай чаргі Краматорскага машынабудаўнічага завода імя Сталіна.

Рапарт дырэктара вашага завода, сакратара партыйнага камітэта і выступленні ўдарнікаў — гэта—яшчэ раз пацвярджаюць. Тут на Краматорскім заводзе, зроблена вялікая справа. Але мы ні на секунду не можам забываць, што другая чарга гэтага гіганта — два вялізных прэсавых цэхі, ТЭЦ, генератарная станцыя — яшчэ не закончаны. Гэтыя цэхі маюць велізарнае значэнне. Без завяршэння гэтай часткі будаўніцтва ваш аграмадны завод не можа лічыцца закончаным.

Першую чаргу мы пабудавалі. Велізарныя сродкі мы ўлажылі, каб даць краіне машыны, абсталяванне ў дастатковай колькасці і найлепшай якасці. Да гэтай справы вы толькі што прыступаеце. Тут трэба паказаць, як умеюць працаваць большэвікі.

У мяне няма ніякіх сумненняў, што нашы інжынеры і тэхнікі, старыя кадравыя рабочыя, нашы ўдарнікі і ўдарніцы, наша выдатная комсамольская моладзь пакажуць каля варштатаў, што на Краматорску ўмеюць не толькі будаваць, але па-большэвіцку асвойваць новыя прадпрыемствы.

Жадаю вам далейшых поспехаў! Жадаю вам далейшых перамог!

Няхай жыве вялікая партыя Леніна-Сталіна, якая арганізавала ў нашай краіне велізарнае будаўніцтва — перамогі соцыялізма! Няхай жыве правадыр нашай партыі, імя якога носіць завод! Няхай жыве тав. Сталін! (Бурныя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю).

На мітынгу з прывітаннем пролетарыям і інжынерна-тэхнічным работнікам выступілі т. т. М. Каганавіч, Шэлехес, Саркісаў, Іваноў і іншыя.

ПРЫВІТАННЕ тав. СТАЛІНУ

КРАМАТОРСК, 27 верасня. (БЕЛТА). Сабраўшыйся 27 верасня ўрачысты пленум Краматорскага горсовета, горпарткома і горпрофсовета сумесна з кіраўнікамі і ўдарнікамі Краматорскага завода і прыбыўшымі на пуск завода гасцямі звярнуўся з наступным прывітаннем да таварыша Сталіна.

«Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Табе, геніяльнаму натхняльніку тварцу соцыялістычнай індустрыі нашай радзімы, урачысты пленум Краматорскага горсовета, горпарткома і горпрофсовета ад імя большэвікоў і пролетарыяў Краматорскі шле палкае большэвіцкае прывітанне.

Іосіф Вісарыёнавіч! Новы Краматорскі завод пабудаваны. Пуск гэтага небывалага завода рушыць наперад перафарміраванне непераможнай соцыялістычнай радзімы. Новы Краматорскі завод—знамянальнае увасабленне ленінскай палітыкі нашай вялікай партыі, кіруемай табой—геніяльным прадаўжальнікам ідэй і спраў Леніна. Мы шчаслівы, што нашаму заводу прысвоена твае дарагое імя. Вось што-б там ні стала даб'ецца поўнага асваення тых магутнасцей каштоўных агрэгатаў, якія даверыла нам краіна.

Няхай жыве ЦК ВКП(б)!

Няхай жыве наш любімы правадыр і настаўнік таварыш Сталін!»

У КОЖНЫМ КАЛГАСЕ ПЕРАВЕСЦІ НА ІЛЬНААПРАЦОЎКУ НЕ МЕНШ 50 проц. РАБОЧАЙ СІЛЫ

НЕАДКЛАДНА АРГАНІЗАВАЦЬ ПЕРААПРАЦОЎКУ І ЗДАЧУ ІЛЬНАВАЛАКНА АДНААСОБНІКАМІ

ДАТЭРМІНОВА І ВЫСОКАЯКАСНА ВЫКАНАЕМ ПЛАН ІЛЬНАЗАГАТОВАК

Лён у гэтым годзе даў добры ўраджай. БССР шырокна правяла пераробленне і рассціл ільну. Гэта абавязвае ўзмацніць барацьбу са стратамі на наступных этапах яго апрацоўкі.

Між тым той факт, што па рэспубліцы на 25 верасня паднята са сцеліш толькі 62 проц. трасты, сведчыць аб няўважлівых і нядбайных адносінах да разасланага ільну. У выніку толькі па 10 ільнаводчых раёнах на 20 верасня каля 20 тыс. гектараў трасты пераляжала на сцелішчах, а па ўсёй рэспубліцы—каля 80 тыс. гектараў. Пералежка трасты прыводзіць да вялікіх страт.

Для пацвярджэння гэтага даволі прывесці прыклад хоць-бы з Суражскага раёна, дзе на словах «змагаюцца» са стратамі, а на 25 верасня на сцелішчах 1.200 гектараў трасты пераляжала. Сураж не выключэнне. Мала дзе канкрэтна змагаюцца са стратамі.

Большасць раённых камітэтаў партыі, райвыканкомаў і палітаддзелаў асабліва ільнаводчых раёнаў, як Нараўлянскі, Асіпавіцкі, Заслаўскі, Старадарожскі і інш., злачынна ігнаруюць барацьбу са стратамі пры рассціле і пад'ёме ільну са сцеліш. Сотні і тысячы гектараў ільну пачарнела ўжо на сцелішчах. Між тым да гэтага часу кіраўніцтва раёнаў гэтай справай не займаецца. Пара раз назаўсёды пакласці канец пагардлівым, панскім, антыпартыйным адносінам да ільнапрацоўкі і ільназдачы ў неільнаводчых раёнах. Гэтыя раёны павінны здаць дзяржаве каля 1/3 усёй ільнапрадукцыі рэспубліканскага плана.

Мала лепшае становішча і ў ільнаводчых раёнах. Побач з такімі раёнамі, як Сенненскі, які падняў усю трасту са сцеліш, ёсць такія раёны, як Чашніцкі, Суражскі, Оршанскі, якія паднялі ўсяго ад 1/3 да паловы ільнатрасты. Не выпадкова, што гэтыя раёны з'яўляюцца апошнімі па ільнаводчай групе па выкананню плана здачы трасты.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб ходзе загатовак ільнапрадукцыі прапанаваў «арганізаваць праз апарат райза штодзённую праверку ходу пад'ёму ільну са сцеліш, каб не дапусціць пералежкі ільну». За выкананне гэтай пастановы трэба змагацца.

Дасканалае сартаванне трасты пры пад'ёме па даўжыні і колеру павышае яе нумарнасць, забяспечвае больш высокі выхад ільну не менш чым на 2-3 нумары.

Неабходна ліквідаваць разрыў паміж пад'ёмам ільну са сцеліш, здачай трасты на ільназаводы і арганізацыяй ручной пераапрацоўкі ільну.

Не менш 50 проц. рабочай сілы ў кожным калгасе перавесці на ільнаапрацоўку. Такая ўстаноўка ЦК. Раённыя камітэты партыі, палітаддзелы, райвыканкомы і ільназагатоўчыя арганізацыі павінны дабіцца выканання гэтай пастановы.

Пры выкананні БССР плана ільназагатовак на 13 проц., аднаасобны сектар выканаў свой план менш чым на 1 проц. Такое становішча паказвае, што справа пераапрацоўкі і арганізацыі здачы ільнапрадукцыі пушчана на самацёк. Задача раённых арганізацый неадкладна арганізаваць пераапрацоўку і здачу ільнапрадукцыі аднаасобнікамі. Мы можам і павінны дабіцца ў бліжэйшы час поўнага выканання плана кожным аднаасобным двароам.

Пастанова ЦК КП(б)Б «Аб ходзе загатовак ільнапенькапрадукцыі» з'яўляецца канкрэтнай праграмай барацьбы за высокаякасны лён. Выкананне гэтых указанняў дасць нам магчымасць датэрмінова выканаць план здачы дзяржаве ільнавалакна высокай якасці.

СКОНЧЫЛІ КАПАННЕ БУЛЬБЫ

СОЎГАС ГОРКІ-АБЧАК, 27 верасня. (Па тэлефону).

Спаборнічаючы з соўгасам Вішнёўка свінасоўгас Горкі-Абчак, Менскага свінаводтрэста, 27 верасня скончыў капаць бульбу. Галоўную ўвагу сканцэнтроўваем на падрыхтоўцы да зімоўкі і зябліве.

Дырэктар соўгаса ЦЕЦЯРУК.
Нач. палітаддзела МАСЕВІЧ.

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ БЕСПЕРАБОЙНУЮ ПЕРАВОЗКУ БУЛЬБЫ І ГАРОДНІНЫ ПРОЛЕТАРСКІМ ЦЭНТРАМ

ГОМЕЛЬ. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Пастанова гомельскага ГК партыі і палітаддзела чыгункі аб разгортванні спаборніцтва чыгуначнікаў з воднікамі на хутчэйшую і высокаякасную пагрузку і перавозку бульбы і гародніны Ленінграду спаткана мясцовымі воднікаў і чыгуначнікаў з вялікім уздымам.

Брыгады грузчыкаў прыстані, вагаўшчыкі перавалачнага пункта, брыгада плывучага перапружальніка і вугольнага склада, уключаючыся ў спаборніцтва, высунулі лозунг. «Хуткая перавозка бульбы і гародніны пролетарыям Ленінграда—справа гонару воднікаў».

У сваіх соцабавязацельствах яны прадугледжваюць недапушчэнне ні мінуты пераапрастою параходаў і барж пад нагрузкай і выпруз кай, перавозак без страт і т. д.

Паміж трыкутнікамі чыгуначнай станцыі і портпрыстані заключан соцыялістычны дагавор па забяспячэнню бесперабойнага прасоўвання бульбы і гародніны Ленінграду і Маскве.

Р.

Усебеларуская ДОШКА ГОНАРУ

«Соцыялістычнае спаборніцтва гаворыць: адны працуюць дрэнна, другія добра, трэція лепш,—ДАГАНЯЙ ЛЕПШЫХ і дабіся АГУЛЬНАГА ЎЗДЫМУ».
(СТАЛІН).

Па прадстаўленню Чэрыкаўскага РК КП(б)Б, рэдакцыя „Звязды" заносіць на ўсебеларускую дошку гонару:

ГОРКАЎСКІ СЕЛЬСОВЕТ. Сельсовет выканаў план хлебапаставак і звярнуў насенпазыку дзяржаве высокаякасным сухім збожжам адным з першых у раёне.

Уборка зернавых праведзена высокаякасна да 20 жніўня. Сельсовет заняршае абмалот і засыпку насенных і страхавых фондаў па калгасах. Свірны, дзе захоўваецца абмалочанае збожжа, прадэзінфекаваны і ахоўваюцца.

Сяўба азімых на плошчы ў 1434 гектары закончана к 2 верасня. План сіласавання выканан на 20 жніўня.

Сельсовет калектывізаван на 100 проц.

Старшыня сельсовета—тав. Шах.

МІРАГАШЧАНСКІ СЕЛЬСОВЕТ. Калгасы і аднаасобнікі гэтага сельсовета ўборку правялі ў спісныя тэрміны і пры мінімальных стратах. Да 10 жніўня адным з першых у раёне закончыў хлебапастаўкі і звароз пазыкі. Свірны прадэзінфекаваны і абмалочанае збожжа захоўваецца добраякасна.

Сяўба азімых закончана 1 верасня. План сіласавання выканан 10 жніўня.

Старшыня сельсовета—тав. Жарэнкаў.

КАЛГАС „БОЛЬШЭВІК", Ушакоўскага сельсовета. Калгаснікі 14 жніўня закончылі ўборку зернавых. Уборка праведзена без малейшых страт. Усё ажатае збожжа добра прасушана і звезена з поля.

2 жніўня калгас выканаў план хлебапаставак і звярнуў насенпазыку дзяржаве.

План сяўбы азімых выканан 1 верасня. 15 жніўня выканан план сіласавання.

Старшыня калгаса—тав. Гуркоў.

КАЛГАС „ЧЫРВОНЫ ОКЦЯБР", Вепрынскага сельсовета. Уборку зернавых правёў у спісныя тэрміны і пры мінімальных стратах.

Да 8 жніўня калгас поўнасцю выканаў свой план хлебапаставак. Пабудован трохпавярховы свіран, які з'яўляецца адным з лепшых у раёне. Свіран прадэзінфекаван і збожжа захоўваецца добра.

Калгас датэрмінова закончыў сяўбу азімых на плошчы 305 гектараў. План сіласавання выканан.

Старшыня калгаса—тав. Макштароў.

КАЛГАС „СЕРП І МОЛАТ", Лабкаўскага сельсовета. Уборку ўраджаю на плошчы 140 гектараў закончыў 1 жніўня.

Да 8 жніўня калгас выканаў поўнасцю план хлебапаставак. Датэрмінова закончана сяўба азімых і перавыкананы план сіласавання.

Старшыня калгаса—тав. САЎЧАНКА.

ПРЫВІТАННЕ МЕНСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б

Байцам, камандзірам, палітработнікам 7-й кавалерыйскай Самарскай імя англійскага пролетарыята чырвонасцяжнай дывізіі ў дзень святкавання пятнаццацігадовага юбілея дывізіі — большэвікі г. Менска шлюць палкае большэвіцкае прывітанне.

Менская партыйная арганізацыя, а разам з ёю ўсе працоўныя ганарацца вашымі поспехамі ў справе баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Працуючы нястомна над узняццем сваёй баявой і палітычнай падрыхтоўкі пад кіраўніцтвам КП(б)Б, яна прымала актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве.

Упэўнен ў далейшых поспехах вашых у справе падрыхтоўкі да абароны нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

Няхай жыве ВКП(б)—кіраўнік і арганізатар Чырвонай арміі!

Няхай жыве правадыр сусветнага пролетарыята вялікі Сталін!

Няхай жыве лепшы ў свеце палкаводзец лепшай у свеце арміі—тав. Варашылаў!

Нам. сакратара менгаркома КП(б)Б ХАДАСЕВІЧ.

1 кастрычніка ў 8 гадзін вечара ў Доме партактыва (вялікая зала для сеткі партыйнай і комсамольскай асветы АДБУДЗЕЦЦА

Даклад тав. ДЗІМІТРАВА

АБ 70-ГОДДЗІ 1-ГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА.

Яўка ўсіх прапагандыстаў, сакратароў парткомаў і парторгаў абавязкова. Уваход па партыйных і комсамольскіх білетах.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

„КАЛГАСНЫ ШЛЯХ—ШЛЯХ СОЦЫЯЛІЗМА З'ЯУЛЯЕЦЦА АДЗІНА-ПРАВІЛЬНЫМ ШЛЯХАМ ДЛЯ ПРАЦОУНЫХ СЯЛЯН" (СТАЛІН)

УРОКІ НЕ УЛІЧАНЫ

ПОЛАЦК. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

У калгасы Гомельскага сельсовета, Полацкага раёна, за апошні месяц уступілі 82 бядняцка-сярэдняцкія гаспадаркі. У гэтым сельсавеце да ліпеня было чатыры калгасы. Да таго часу тут ніякай арганізацыйна-масавай работы па прыліву не праводзілася. Былое кіраўніцтва сельсовета на чале з старшынёй Скрабатуном ставіла рад перашкод пры ўступленні ў калгас працоўных аднаасобнікаў.

У тым-жа месяцы РК змяніў кіраўніцтва сельсовета. Новы старшыня тав. Піткін па-сапраўднаму вызучыў прычыны застою калектывізацыі ў сельсавеце. Перш за ўсё была праведзена праверка, як аднаасобнікі выконваюць свае абавязкі перад дзяржавай і як праводзілася ў сельсавеце зямельная і фінансавая палітыка. Пры праверцы выявіліся факты, што калгаснікі плацілі больш падатак, чым аднаасобнікі. На 7.500 рублёў калгасы і калгаснікі былі вызвалены ад няправільна налічанага падатку. Разам з тым аднаасобнікі былі недаабкладзены на 12.000 рублёў. Некаторыя аднаасобнікі фактычна мелі 8-9 гектараў зямлі, а плацілі падатак з разліку 4-5 гектараў. Апрача гэтага дадатковыя даходы пры абліку абкладання ў аднаасобных гаспадарках не ўлічваліся.

Гэтыя памылкі былі выпраўлены. Працоўныя аднаасобнікі сапраўды ўбачылі, што калгасы трымліваюць тыя ільготы, якія прадугледжаны. Выканаўшыя свае абавязкі перад дзяржавай, яны пачалі ўступаць у калгасы. Гэтаму спрыялі рэзультаты бягучага гаспадарчага года раду перадавых калгасаў. Калгаснікі калгасаў «Іскра» і «Октябр» у гэтым годзе атрымалі на працадзень у два разы больш, чым у мінулым. У рэзультаце 41 аднаасобная гаспадарка ўступіла ў гэтыя калгасы. За апошні час у сельсавеце арганізаваны два новыя калгасы.

Шырокая арганізацыйна-масавая работа па калектывізацыі была правезена па Ветрынскаму і Гарадоцкаму сельсоветах. У выніку ў калгасы Гарадоцкага сельсовета ўлілося 100 гаспадарак.

Аднак, у раёне рад сельсоветаў яшчэ дапускаюць скрыўленні ў правядзенні зямельнай і фінансавай палітыкі, што значна адбіваецца на агульным ходзе калектывізацыі і масавага прыліву. Характэрны прыклад у Кушлікоўскім сельсавеце. Вясною старшыня гэтага сельсовета Грыгор'еў прыслаў у райза дакладную запіску з патрабаваннем зняць з аднаасобнікаў 130 гектараў зямлі, якая нібы перайшла ў калгасы. Выявілася, што гэта зямля асталася ў аднаасобным сектары, яна ніколі не пераходзіла ў калгасы. У аднаасобніка вёскі Карачы Мачульскага лічыцца засеянай зямлі 5 гектараў. За гэтыя 5 гектараў ён і плаціў падатак. А калі абмералі, то аказалася, што ў яго фактычна не 5, а 13,85 гектара.

Другі прыклад у Мала-Сіднянскім сельсавеце. Тут ёсць 57 аднаасобных гаспадарак. Гэтым аднаасобным гаспадаркам даведзен план вывазкі лесу па 10 куб. метраў на каня. Але гэтыя аднаасобнікі план вывазкі недавыканалі на 20 куб. метраў. Старшыня сельсовета замест прыцягнення да адказнасці зрыўшчыкаў лесазагатовак дагаворваецца з дырэктарам лесаўчастка і пераводзіць гэтыя 20 куб. метраў на калгас імя Сталіна. Калгасу даведзен план замест 100 куб. метраў 390. Такое-ж становішча і ў Верхачэнскім сельсавеце.

У раёне яшчэ не ўлічаны гэтыя ўрокі і не зняты рагаткі са шляху калгаснага прыліву. За апошні час у калгасы раёна ўступіла больш 500 гаспадарак. Калі-б на месцах быў выкарыстан вопыт Гомельскага сельсовета па барацьбе за правільную зямельную фінансавую палітыку, масавы прыліў быў-бы бясспрэчна забяспечан.

НЕЙДЛІН.

ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНА

У калгасы Жыткавіцкага раёна за жнівень уступіла 305 аднаасобных гаспадарак. Гэтыя аднаасобнікі поўнасцю выканалі хлебапастаўкі.

Масавая работа сярод аднаасобнікаў і добрыя вынікі гаспадарчага году па калгасах спрыяюць новаму прыліву.

Нацыянальны калгас «Чырвоная града» атрымаў ураджай з гектара: пшаніцы 120 пудоў, ячменю — 140 пудоў. У гэты калгас уступіла 10 аднаасобнікаў.

Новаўступіўшыя гаспадаркі ў калгасы Вятчынскага сельсовета звярнуліся з пісьмом да ўсіх аднаасобнікаў раёна. Пасля распрацоўкі гэтага пісьма на сходзе аднаасобнікаў населішча Белічы, Юркевіцкага сельсовета, ў калгас уступіла 10 аднаасобнікаў. Ідэя распрацоўка пісьма і сярод аднаасобнікаў другіх населішч.

ДЗЯТЛОЎСКІ.
Рэдактар райгазеты.

ХРОНІКА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ

ХОЙНІКІ.

У калгасы зоны дзейнасці Хойніцкай МТС за апошні месяц УСТУПІЛА 800 бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак. Процант калектывізацыі па зоне ўзрос з 49 да 68.

Рэдактар палітаддзельскай газеты НАФТУЛІН.

***

БАРЫСАЎ.

У выніку прапрацоўкі артыкула тав. Гікало ў НЕМАНІЦКІМ сельсавеце арганізаваны два новыя калгасы імя ГОРКАГА і «ЧЫРВОНЫ САМАЛЁТ».

Пашыраецца прыліў у калгасы МЕТЧАНСКАГА і АЗДЗЯЦІЦКАГА сельсоветаў.

ПРУСАК.

ГАРАДОК.

У Вяханскім сельсавеце за другую палову жніўня і верасень АРГАНІЗАВАЛАСЯ 7 НОВЫХ КАЛГАСАЎ, у якія ўлілося 136 бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак. У існуючыя калгасы за гэты час уліліся 152 гаспадаркі.

У Селішчанскім сельсавеце за апошнюю дзесяцідзённку арганізаваны ДВА НОВЫЯ КАЛГАСЫ, куды ўступілі 24 гаспадаркі і ў існуючыя ўлілося 17 гаспадарак.

Усяго па зоне МТС за апошні месяц уступіла ў калгасы 357 гаспадарак.

Рэдактар палітаддзельскай газеты ЗЕЛЬТЦЭР.

21 верасня ў Лёзне адбыўся раённы алёт ільнатрапальшчыкаў.
НА ЗДЫМКУ: ільнатрапальшчыцы на алёце.

ПРЫЧЫНЫ ЗАСТОЮ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ У ЧЭРЫКАЎШЧЫНЕ

ЧЭРЫКАЎ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

У Чэрыкаўскім раёне пытанне барацьбы за далейшую калектывізацыю яшчэ не стала ў цэнтры ўвагі райпартарганізацыі.

Яркім прыкладам таго, што ў раёне не займаюцца справай арганізацыі новага прыліву ў калгасы, сведчыць хоць-бы той факт, што і сёння ў райза — у гэтым кіруючым цэнтры калгаснай вытворчасці, як і ва ўсіх другіх арганізацыях, няма правільных лічбаў становішча калектывізацыі ў раёне.

У райза прытрымліваюцца аднаго, што большасць аднаасобнікаў «не падлягаюць калектывізацыі». І ў графу «ненадзейных» заносяцца сотні сумленных аднаасобнікаў. Адсюль зразумела, чаму кіраўнікі райза дакаціліся да вываду, што справа калектывізацыі нібы даўно вырашана ў Чэрыкаўшчыне.

Між тым лічбы гавораць аб адваротным. У раёне яшчэ налічваецца каля 1.500 аднаасобных гаспадарак, з іх 9/10 безумоўна сумленных аднаасобнікаў, якіх можна і трэба ўцягнуць у калгасы.

Другая, не менш важная прычына затрымання масавага прыліву ў калгасы раёна — адсутнасць кіраўніцтва і дапамогі нова-арганізаваным калгасам.

У калгасе «XVII партз'езд», Зябенскага сельсовета з дня яго арганізацыі (6 месяцаў) ні разу не быў прадстаўнік райза. Тут калгаснікі не ведаюць, што такое здзельшчына.

Побач з гэтым калгасам на пасёлку Хаўменка арганізован другі калгас імя Галадзеда. Не гледзячы на тое, што ён арганізован у чэрвені, калгаснікам налічан сельска-гаспадарчы падатак, страхоўка і самаабкладанне як аднаасобнікам.

Арганізатар і старшыня калгаса тав. Харытоненка Саўка паабіваў парогі райфа, але нідзе нічога не дабіўся.

АРЦЁМ СТАЛЬ.

На партыйныя тэмы

АБ ПАСТАНОЎЦЫ УЧОТУ КОМУНІСТАЎ

28 верасня аддзел кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б правёў нараду заг. учоту гаркомаў і райкомаў КП(б)Б па пытанню пастановкі ўчоту комуністаў.

Выступаючы на нарадзе тав. Піпкін (аддзел кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б, асабліва падкрэсліў, што ўказанні ЦК ВКП(б), ўказанні старшыні камісіі па чыстцы КП(б)Б тав. Анціпава аб арганізацыі строгага ўчоту комуністаў не выконваюцца радам райкомаў і парткамітэтаў.

У Магілеўскім раёне наяўнасць комуністаў не адпавядае ўчоту, які вядуць у гаркоме. Напрыклад, па вестках гаркома ў партарганізацыі магілеўскай фабрыкі лічыцца на 19 комуністаў больш, чым ёсць іх. На заводзе імя Сталіна 20 комуністаў лічыцца па ўчоце гаркома, якіх на заводзе няма, а пяць комуністаў, якія працуюць на заводзе, чамусці не лічацца на ўчоце гаркома.

Не лепш і ў Віцебскім, Жыткавіцкім, Горацкім, Старадарожскім і іншых раёнах.

Зусім пізні якасны ўчот па цэламу раду раёнаў. Часта змены роду заняткаў, павышэнне палітычнай асветы і інш. не завосяцца ў партыйныя карткі. Ёсць факты прадстаўлення недакладных вестак на комуністаў у ЦК асобнымі раёнамі па асобных паказальніках учоту.

Усё гэта сведчыць аб тым, што гаркомы, райкомы і парткомы не звяртаюць часамі належнай увагі на пастаноўку партыйнага ўчоту. У той час, калі сакратары райкомаў і партарганізацый персанальна адказваюць за становішча ўчоту, работнікі ўчоту гаркомаў і райкомаў не звязаны з першапачатковымі партарганізацыямі, не правяраюць становішча ўчоту ў первічных партарганізацыях.

Зусім няма ўчоту спачуваючых у большасці райкомаў партыі.

Для ўніклення памылак, якія часамі робяць работнікі ўчоту, на нарадзе былі прапрацаваны формы ўчоту комуністаў.

МЕНСКІ ГАРКОМ АБ СОЦСПАБОРНІЦТВЕ Ў ПАРТВУЧОБЕ

Менскі гарком КП(б)Б выпрацаваў умовы конкурса на лепшую пастаноўка марксісцка-ленінскага выхавання комуністаў і комсамольцаў.

Умовы конкурса прадугледжваюць уключэнне ў соцспаборніцтва ўсіх парткомаў, партгруп, школ і гурткоў і разгортванне індывідуальнага спаборніцтва пад лозунгам: «Кожны слухач партшколы—ударнік на вытворчасці».

Асноўныя паказальнікі конкурса для партыйных камітэтаў, партгруп і слухачоў — гэта 100-процантны ахоп комуністаў, комсамольскага актыва, кандыдатаў партыі і слухачоў усімі ведамі партыйнай асветы. Абавязковая паперэдняя прапрацоўка матэрыялаў слухачамі, абавязковая чытка газет і выпуск насценгазет у школах, калектыўныя паходы ў кіно, тэатр і наведванне музеяў, абавязковая прапрацоўка слухачамі аднаго мастацкага твора і твора класікаў марксізма ў месяц.

Для прапагандыстаў — добрая падрыхтоўка да заняткаў, ніводнага зрыву, ведаць умовы працы слухачоў сваёй школы і гуртка, шчыльна ўвязваючы партвучобу з выкананнем практычных задач прадпрыемства і інш.

Устаноўлен пераходны сцяг і прэміі. Першая прэмія—пераходны сцяг і 1.000 руб. для абсталявання партгабінета на прадпрыемстве; другая прэмія—абсталяванне партгабінета на прадпрыемстве ў суме 500 руб. (4 прэміі): трэцяя прэмія—40 бібліятэчак па 50 руб. кожная; чацвертая прэмія—экскурсія лепшай школы-гуртка ў Маскву або Ленінград; пятая—экскурсія 15 чал. у Маскву або Ленінград для лепшых прапагандыстаў, інструктароў ГК, сакратароў парткомаў і парторгаў; шостая прэмія—пастаянае месца ў тэатр на адзін месяц (3 прэміі); сёмая—пастаянае месца ў кіно на 2 месяцы (5 прэмій).

СОН І РЭАЛЬНАСЦЬ

На вуліцы, дзе жыве Вова—вялікае возера. І якое! Мора. Не высыхае нават у самыя гарачыя летнія месяцы.

У Вовы і яго таварышоў з гэтым возерам многае звязана, часам сумнае, часам, наадварот, вясёлае.

Бывае так. У самы разгар гульні ў канцы вуліцы паказваецца нагружаная фурманка ці аўтамабіль. Стоп. Конь, напружваючы ўсе сілы, не можа зрушыць воза ні на крок. Буксуе і аўтамашына.

Здранніцкая гразь засмоктвае калёсы. Фурман або шофер злуе перш на праз, потым на каня ці машыну, пасля на аддзел добрабыту, горсовет. Нічога не дапамагае.

Вясёлая дзетвара ў такіх выпадках спыняе гульню і бяжыць на выручку загрузшага воза ці машыны. Працуе шчыра і натужыста, падносячы палешні, склікаючы людзей, аж да таго часу, пакуль не збярэцца натоўп дарослых.

Калі-ж прыдуць дарослыя, дзетвара залазіць на абшарпаны каштан, які тут-жа расце, і адтуль вельмі ўважліва слухае гучныя, часта нецэнзурныя эпітэты і разважанні дарослых аб тых дядзях з аддзела добрабыту горсовета, па чыёй віне надрываюцца коні, псуюцца машыны.

Але ўсяму бывае канец. У адно сонечнае ранне, усхапіўшыся з пасцелі, Вова хутка падбег к вакну. Ён чамусці быў упэўнен, што за ноч мора не стала, і вельмі здзівіўся, заўважыўшы, што на вуліцы ўсё па-стараму, як і было ўчора.

Тым не менш. У гэты-ж дзень Вова заявіў сваёй маме: :

— Балота пад нашым акном хутка будзе засыпана і вуліца забрукавана каменнямі.

Гэта ён бачыў у сне, але маме не прызнаўся, ведаючы, што яна-б сказала, што снам верыць нельга. Вова любіў сваю маму, але ў падобных справах незаўсёды ёй верыў.

Ды і як-жа ёй верыць. Калісці яна запэўняла Вову, што дрэвы не толькі вялікія, але і малыя ламаць, а, тым больш, вырубаць нельга. Між тым прышлі чужыя дзядзі і тры самыя любімыя Вовіны каштаны ссеклі. Мала гэтага: Вова памятае і яшчэ больш сумныя факты. Гэтыя-ж самыя дзядзі высеклі цэлы сад, куды ён часта бегаў гуляць са сваімі таварышамі.

Вова чакаў, пакуль пачнуць засыпаць лужу. Чакаў дні... тыдні... месяцы. Кожны дзень прыставаў з запытаннямі да маці і маці калі-ж, нарэшце, з'явіцца гэтыя дзядзі. А дзядзі ўсё не прыходзілі і не прыходзяць засыпаць возера на вуліцы пад акном.

Вова засумаваў і стаў настойліва дапытвацца, у чым-жа справа. Нарэшце, даведаўся. Аддзел добрабыту горсовета і загадчык гэтага аддзела Бімбат заняты куды больш важнымі справамі, чым прывядзенне ў парадак не цэнтральных вуліц і асабліва рабочых ачэпаін.

Вова зразумеў усё гэта. Зараз ён сам ужо лепш не прафесар па ўсіх справах работы аддзела добрабыту. Запытайце ў Вовы, чым займаецца гэты аддзел, і ён вам без замінкі адкажа:

— Машчэннем, размашчэннем і зноў машчэннем і перамашчэннем Ленінскай вуліцы.

—Для чаго гэта робіцца?

— Для таго, каб днём нельга было прайсці і праехаць па вуліцы, а ночу лёгка паламаць ногі.

—Вова, для чаго на Ленінскай вуліцы праводзіўся трамвай?—запытаеце вы. І ён вам тут-жа адкажа:

— Для таго, каб на другі год было што пераносіць на Інтэрнацыянальную, а на трэці—на Койданаўскую, ці яшчэ на якую-небудзь вуліцу.

—Што рабілася раней і робіцца зараз на Інтэрнацыянальнай вуліцы?

Выбіралі булыжнік, для таго, каб замасціць вуліцу брусчаткай. Зараз знімаецца брусчатка і вуліца мосціцца клінкерам для таго, каб па будучы год знясць клінкер і зноў пачаць масціць булыжнікам, як гэта і было раней.

Так бойка, пытанне за пытаннем? Вова растлумачыць вам усё. Больш таго яшчэ даласць: так будзе рабіцца, пакуль у аддзеле добрабыту будуць сядзець цвёрдалобыя чыноўцы.

Наўрад ці Вова перахлёствае. Не, здаецца, наадварот. Калі-ж крыху і перахлёствае, яму можна дараваць, ён маленькі.

Але нельга дараваць «дзядзям» з аддзелу добрабыту горсовета здзекаў над людзьмі, машынамі, дрэвамі, коньмі.

***

Да рэчы, дзе-ж жыве Вова? Зразумела, у Менску, на многіх вуліцах. Бацька яго працуе па фабрыцы, заводзе, ва ўстанове. Мама хозяйнічае, кааператыў і школу, дзе займ[illegible] брацік Вовы.)

Л. РАБЦЭВІЧ.

ЛЕПШЫ ВОПЫТ РАБОТЫ ЯРОМКАЎСКАГА СЕЛЬПО ПА ЗАКУПЦЫ ХЛЕБА НА УСЮ КААПЕРАЦЫЮ БССР

ЗА ПРАВА РАПАРТА З'ЕЗДУ СОВЕТАЎ

Да ўсіх сельпо, да ўсіх актывістаў кааперацыі БССР

Наша Яромкаўскае сельпо, Аршанскага раёна, прыходзіць да чацвертага квартала з добрымі паказальнікамі. План тавараабароту трэцяга квартала нам перавыкананы. Мы не задаволіліся атрыманымі планавымі тавараў. Мы самі закупілі па базах тавараў на 15.000 руб., а наш план самазакупак у 10.000 руб.

План рабілікацыі сродкаў у 2.500 руб. сельспажыўтаварыстам выканан поўнасцю. Кампенсаваны квартал з прыбыткам у 7.000 рублёў.

Мы добра зразумелі ўсё значэнне палітычнае значэнне дзяржаўнага гандлю хлебам. Адразу-ж, пасля ажыццяўлення абавязковых хлебапаставак, мы па-бальшэвіцку, сур'ёзна ўзяліся за разгортванне масавай работы па дзяржаўных закупках хлеба. Мы не чакалі, пакуль калгасы прыязуць хлеб. Самі пашлі ў калгас. Праўленне сельпо не абмежавалася выключна на свае сілы. Яно прыцягнула да закупак увесь актыў, усю грамадзкасць сельсовета, памятаючы, што арганізацыя справы залежае поспех.

Перш за ўсё, мы абгаварылі канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыі работы па закупках хлеба на пашыраным пасяджэнні праўлення, потым на пасяджэнні кааперацыйнай секцыі сельсовета. Усе члены сельсовета, члены праўлення сельпо, настаўнікі, комсамольцы былі прымацаваны да насельных пунктаў, да ўчасткаў. Атрымаўшы заданне, наш актыў разышоўся па калгасах. Праводзілі там пасяджэнні праўленняў, сходы калгаснікаў, гутарылі ў брыгадах, пабывалі ў хатах, арганізоўвалі чытку газет з матэрыялам аб закупках. З лічбамі ў руках мы даказвалі калгаснікам выгаду продажу хлеба дзяржаве.

Прыцягнулі мы да актыўнай работы дэпутацкія групы калгасаў. Яны нам па многім дапамаглі. Яны задавалі «тон» на сходах, арганізоўвалі спаборніцтва калгасаў і калгаснікаў. І сёння мы адзначаем асаблівую ўдарную работу дэпутацкіх груп калгасаў «Новыя Гарбацевічы» (кіраўнік групы Ярышаў), «Чырвоныя Яромкавічы» (кіраўнік тав. Фралоў) і т. д.

Наша сельпо ўжо атрымала рад патрэбных калгаснікам тавараў: шкло, мыла, махорку, пюрныя вырабы, цвікі і мануфактуру. Але наколькі ёсць попыт на веласіпеды і самавары, мы падалі адпаведную заяўку ў райспажыўсаюз.

Мы цвёрда памятаем, што разгортванне дзяржаўных закупак хлеба з'яўляецца адной з магутных крыніц выканання плана тавараабароту. Вось чаму мы ўпэўнены, што хлебазакупкі дапамогуць нам перавыканаць гандальфінплан.

Да 26 верасня ўжо закупілі для дзяржавы каля 30 тон хлеба. Хлеб паступае вялікімі партыямі і чырвонымі абозамі адпраўляецца ў горад на прыёматныя пункты.

Нельга дапусціць, каб кааперацыя чакала прыходу калгаснікаў за таварамі ў крамы. Нашы фургоны з таварамі, выязджаюць у калгасы для абслугоўвання прадаўцоў хлеба.

Мы абавязаемся за што-б там ні стала ажыццявіць тыя абавязацельствы, якія ўзялі на сябе калгасы і калгаснікі па продажу дзяржаве хлеба.

Краіна рыхтуецца да сустрэчы VII з'езда советаў.

Мы выклікаем усе сельпо і ўвесь кааперацыйны актыў на соцыялістычнае спаборніцтва па паспяховай закупцы хлеба, па сапраўднай пораўнаўчай работе сваіх крам, якія павінны стаць ачагамі совецкага культурнага гандлю. Аб'яўляем спаборніцтва на права рапарту VII з'езду советаў аб лепшай рабоце сельпо.

Ад імя праўлення сельпо і калгактыва
ЯРЫШАЎ, МЯЖУЕЎ, ІСАЧАНКА, КОНТУРАЎ, БАЯРАЎ, СІНДРЭНКА, ЯКІМАЎ, АСТАЛЕНКА.

СПАБОРНІЦТВА РАЗГОРТВАЕЦЦА

У калгас «Слава», Пагарэльскага сельсовета (Асіпавіцкі раён), прыбыла буксірная брыгада з калгаса «Комунар» у ліку 20 чалавек.

Буксірная брыгада ад імя ўсіх калгаснікаў калгаса «Комунар» прадявіла калгаснікам калгаса «Слава» соцыялістычны рахунак па продажу дзяржаве лішкаў хлеба.

Разгарнуліся спрэчкі. Тав. Казёла Пётра з калгаса «Слава» заявіў: «Калі калгаснікі калгаса «Комунар» прадалі дзяржаве 20 тон хлеба, дык нашаму калгасу, больш эканамічна моцнаму, сорам адставаць. Вось я ў гэтым годзе атрымліваю 100 пудоў хлеба, — гаворыць ён. — Куды-ж я дзену столькі збожжа? Я мяркую прадаць дзяржаве 15 проц. хлеба, што прыпадае на мае працадні. Выклікаю паследваць майму прыкладу ўсіх калгаснікаў нашага калгаса».

Яго змяняе калгасніца Ваўчок Л.

— Нам, калгаснікам, патрэбна прадаць свае лішкі хлеба толькі дзяржаве. Наш хлеб не можа папасці ў рукі спекулянта і перакупшчыка. Я цалкам згаджаюся з прапановай тав. Казёла і таксама прадаю дзяржаве 15 проц. збожжа, прыпадаючага на мае працадні.

Следам за тав. Ваўчок бярэ слова калгаснік Кедзіч Алесь:

— Нам патрэбна як след абсталяваць клуб, радыё, набыць калгасную бібліятэку. І гэта мы можам набыць, шляхам продажу дзяржаве лішкаў хлеба.

У гэтым-жа напрамку выказаўся і рад іншых калгаснікаў. Сход пастанавіў прадаць дзяржаве 25 тон хлеба. Пасля сходу калгаснікі калгаса «Слава» разам з буксірнай брыгадай арганізавалі таварыскую вячэру, пасля быў спектакль.

Скончыўшы сваю місію ў калгасе «Слава», буксірная брыгада накіравалася ў Градзянскі сельсавет для арганізацыі закупак хлеба.

ІРАЦЗЎСКІ.

РАЗБІЦЬ КУЛАЦКА-НЭПМАНСКІЯ НАСТРОІ

(Ад карэспандэнта «Звязды»).

Ва ўсіх калгасах Любаньскага раёна праводзіцца папярэдняе размеркаванне ўраджаю. Калгаснікі рэальна бачаць як высока цэніцца іх добраякасная работа. Маючы лішкі хлеба, калгаснікі на сваіх сходах пастанаўляюць прадаць яго дзяржаве. Калгаснікі калгаса «Новы шлях», Юшкаўскага сельсовета, пастанавілі прадаць дзяржаве па 500 грам хлеба з кожнага працадня і такім чынам прадалі 25 тон. Калгаснікі калгасаў «Комсамолец» прадалі 24 тоны, «1 жніўня» — 50 тон, «Чырвоны земляроб» — 15 тон і т. д.

Застрэльшчыкамі разгортвання спаборніцтва па продажу дзяржаве хлеба з'яўляюцца комуністы, калгаснікі — актывісты. Так, старшыня калгаса «Будаўнік», Рэчыцкага сельсовета, тав. Ізох прадаў дзяржаве адну тону хлеба. Старшыня калгаса «1 жніўня» Прушак—0,5 тоны.

Але ў першыя-ж дні продажу дзяржаве хлеба выяўлен кулацка-спекуляцыйны настрой старшынь некаторых калгасаў. Так, старшыня калгаса «Большэвік», Юшкаўскага сельсовета, Бародзька (член партыі) пры ўраджаі вышэй сярэдняга (10 цэнтн. жыта з га) наўмысна зменшыў ураджай да 7 цэнтнераў з гектара, стварыў удвая большыя кармовыя фонды і ў папярэднім размеркаванні «вылічыў», што на працадзень прыпадзе толькі 1.600 грам зернавых. Значыцца, дзяржаве няма чаго прадаць.

Сапраўды-ж калгаснікі калгаса «Большэвік» атрымліваюць на працадзень больш, чым 3,5 кгр. Манеўр класава-варожага нам элемента Бародзька быў выкрыт самімі калгаснікамі і яму быў дан адпор. Калгаснікі пастанавілі прадаць пэўную колькасць збожжа.

Дрэнна працуе ў раёне таксама і кааперацыя. Калі калгаснікі калгаса «Новы шлях», Юшкаўскага сельсовета, прывезлі ў сельпо для продажу дзяржаве 25 тон хлеба, дык у сельпо нічога, акрамя махоркі, не аказалася.

Слаба разгорнута ў раёне масавая работа сярод аднаасобнікаў. Аднаасобнікі Любаньшчыны амаль не прыступілі да продажу лішкаў свайго хлеба.

Памылкі першых дзён павінны быць улічаны. Недахопы неабходна ліквідаваць. Масавай работай павінны быць ахоплены ўсе аднаасобнікі. Кулацка-спекуляцкім настроям трэба даць рашучы адпор.

АНЕТ.

НАШЫ ДАХОДЫ ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ У ДВА РАЗЫ

У Парыцкім раёне разгарнуліся хлебазакупкі. Калгаснікі з вялікай ахвотай прадаюць свае лішкі хлеба дзяржаве. Калгас «Барэц Пятроўскага», Валасевіцкага сельсовета, прадаў дзяржаве 15 тон хлеба. Калгаснікі гэтага калгаса на агульным сходзе заявілі: «Нашы даходы ў гэтым годзе павялічыліся ў два разы супроць мінулага года і ўсе лішкі прадамо толькі дзяржаве. Не дамо спекулянту і перакупшчыку ніводнага кілограма збожжа».

Калгаснікі калгаса «Соц-Взг», Шчадрынскага сельсовета, прадалі дзяржаве 11 тон. Калгас Комінтэрн», Любаньскага сельсовета — 18, калгас «Серп і молат» — 9.

Толькі за адзін дзень калгасы, калгаснікі і працоўныя аднаасобнік Чэрнінскага сельсовета, прадалі дзяржаве 36 тон збожжа, а па Лашавіцкаму сельсовету — 25 тон.

ЛАШКЕВІЧ.

РАШАЕ добрае кіраўніцтва

Дзве арцелі. Абедзве—шэйныя. Умовы аднолькавыя: і рабочыя ёсць, і сыравіна, і ўсё, што неабходна для выканання планаў. Адна працуе добра, з'яўляецца лепшай арцеллю ў БССР. Другая адстае.

У чым прычына добрай работы арцелі імя Крупскай і дрэнная работы арцелі «Перамога»? Азнаямленне з работай гэтых арцелей паказвае, што ўсё рашае ДОБРАЕ КІРАЎНІЦТВА, умелы падыход да справы. Там, дзе на чале арцелі стаіць сапраўдны кіраўнік, які можа ўзняць працоўную дысцыпліну, правільна выкарыстоўваць матэрыялы, добра паставіць абслугоўванне рабочых, разгарнуць сярод іх социялістычнае спаборніцтва, там поспех забяспечан.

Вопыт гэтых двух арцелей сведчыць аб тым, што саматужная прамысловая кооперацыя БССР мае ўсе ўмовы для выканання планаў. Неабходна, каб арцелі ўключыліся ва ўсесаюзны паход імя VII з'езда советаў, каб да ўсебеларускага з'езда старшынь арцелей прыйсці з поўным выкананнем сваіх планаў.

ПРАЦАВАЦЬ ТАК, ЯК ПРАЦУЕ АРЦЕЛЬ імя КРУПСКАЙ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Стыль работы кіруючага складу бабруйскай трыкатажнай арцелі імя Крупскай (Бабруйск) — гэта стыль канкрэтнага кіраўніцтва. Старшыня арцелі тав. Трубкін, яго намеснік тав. Маліноўскі (ён-жа парторг) пастаянна клапоцяцца аб культурна-бытавых умовах рабочых. У сувязі з падрыхтоўкай да зімы было намечана раманТаваць кватэры для 10 рабочых. 4 адраманТаваны і 6 у рамонце. Закуплена 25 пар абутку для рабочых арцелі. За апошні час якасць абедаў значна палепшылася. Ёсць сталы ўдарнікаў, дзе падаюцца абеды з трох блюд.

Арцель мае яслі, у якіх знаходзіцца 20 дзяцей і 30 на дзіцячай пляцоўцы. Гэта дае магчымасць работніцам займацца ў школах, ліквідаваць сваю няграматнасць і малаграматнасць і павышаць палітычны ўзровень. Арцель мае свой свінарнік, у якім ёсць 27 свіней. Па тэкстыльсаюзу ёсць агульная прыгарадная гаспадарка з 150 гектараў зямлі, 23 галавы буйнай рагатай жывёлы і 35 штук маладняка.

— Спачатку маёй работы ў арцелі імя Крупскай, — кажа тав. Маліноўскі, — вусім не было працоўнай дысцыпліны сярод членаў арцелі. Былі спазненні на работу, ды і ў часе работы не было належнай дысцыпліны. Я праводзіў індывідуальныя гутаркі з рабочымі, штодзенна правяраў, як працуюць асобныя рабочыя.

Пачаўся збор рабочых прапаноў у фонд усебеларускай нарады старшынь промарцелей. У ткацкім цэху рэалізавалі 4 прапановы. Раней работніца працавала на адным варштаце, а зараз яна працуе на двух. Гэты цэх стаў самым перадавым у арцелі. А ў мінулым ён адставаў. План выконваецца на 112 проц.

Па панчошнаму цэху рэалізаваны 2 прапановы: перабудавалі машыны з аднаго размеру выпрацоўкі панчох на другі і пачалі рабіць спайку іголак. Раней, калі зломіцца іголка, яе выкідалі. Зараз, спайваючы паламаныя іголкі, ліквідавалі прастоі. Дзякуючы гэтым рацыяналізатарскім прапановам арцель з'эканоміла 15 тыс. рублёў, а прадукцыйнасць працы павялічылася ў 2-3 разы. Арцель знізіла сабекошт на 3 проц.

У практыку работы ўведзены штодзенныя нарады брыгадзіраў, дзе падагульваецца работа брыгад. Брыгадзіры непасрэдна даводзяць план да кожнага рабочага. Каля кожнага варштата — трафарэтка, на якой брыгадзіры штодзенна адзначаюць заданне і выкананне промфінплана. Па сканчэнні работы відаць, наколькі хто выканаў план.

Арганізаваны пераходныя чырвоныя сцяжкі, якія штодзенна перадаюцца тым рабочым, якія выконваюць свае заданні. Ёсць чырвоная дошка, на якой кожныя 5 дзён адзначаецца выкананне плана асобнымі цэхамі і брыгадамі.

Дзякуючы шырокаму разгортванню соцспаборніцтва, арцель выканала план за 8 месяцаў на 110,3 проц.

Пры арцелі арганізавана школа малаграматных і няграматных, а ўсяго рознымі відамі вучобы ахоплена 79 чалавек. Па цэхах 6 раз у месяц праводзіцца калектыўнае чытанне газет. Арганізован музычны гурток з 10 чалавек.

Арцель імя Крупскай атрымала пераходны сцяг.

КАСЁНАК.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА І САПРАЎДНАСЦЬ

(Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта)

Пажадалі мы знайсці такую арцель, дзе найлепш пастаўлена соцспаборніцтва і большая колькасць ударнікаў. Пачалі шукаць. І знайшлі: 100 проц. рабочых — ударнікі. Арцель знаходзіцца ў мястэчку **Магільная, Уздзенскага** раёна і завецца **«Перамогай»**. Ды, зразумела, як не перамагчы арцелі, у якой 100 проц. арцельшчыкаў — ударнікі?!

Пазнаёміліся з ёю бліжэй. Арганізавалася яна ў 1929 г. Усяго ў арцелі **19** чалавек, з якіх **15** працуюць у мястэчку, а астатнія ў вёсцы **Касцюша**, у аддзяленні арцелі.

Зайшлі ў майстэрню. І сапраўды, у вочы адразу кідаецца чырвоная дошка. На дошцы красуюцца прозвішчы дзесяці асоб. Падлічылі працуючых — таксама дзесяць. Радасна становіцца — усе ўдарнікі. Усе добрасумленна працуюць. Вось тут промфінплан безумоўна перавыконваецца.

Добра. Паратарылі з асобнымі рабочымі і азнаёміліся з работай арцелі. І выявілася дзіўная карціна. Неяк не верыцца: за 8 месяцаў план выкананы на... 45,3 проц. Што такое, у чым справа?

Старшыня арцелі тав. Шытык тлумачыць гэта тым, што бывалі часы, калі не хапала матэрыялаў. Узялі зводку паступлення матэрыялаў і аказалася, што за год саюз павінен быў даць арцелі матэрыялаў на 39 тыс. руб., а даў за 8 месяцаў на **25.531** руб. З 1933 г. астаўся невыкарыстаным матэрыял па суму **3.562** руб. Па плану арцелі патрэбна ў месяц матэрыялу на **3.250** руб. Атрыманы-ж тавар і астача мінулага года разам складаюць за 8 месяцаў **28.084** руб. Такім чынам на кожны месяц тавараў прыпадае на 5.510 руб.

Значыць, таварамі забяспечаны. Дзе-ж прычына невыканання промфінплана, што перашкаджае?

Аказалася, што за 1934 год арцелью кіруе трэці старшыня праўлення і кожнаму з іх прыходзіцца знаёміцца з вытворчасцю, вучыцца кіраваць, пакуль яго не зніімаюць. Сярод членаў арцелі няма ніякай дысцыпліны. Больш таго — некаторыя не з'яўляюцца на работу па **месяцу і больш.**

Так, рабочыя **Бондар, Паграмонаў і Лыч** з 15 чэрвеня па 1 жніўня не працавалі ні аднаго дня, а потым з'явіліся. І нічога, працуюць. Такіх 8 чалавек.

Кіраўніцтва арцелі ніякіх захадаў да гэтых прагульшчыкаў не прыняло.

У арцелі зусім не разгорнута культурна-масавая работа. Аб соцспаборніцтве ніхто не ведае, ды і пра ўдарніцтва гаварыць цяжка. Ні адзін не здаў соцтэхэкзамена.

Вывад: арцель мае ўсе ўмовы для таго, каб выканаць свой план. Не хапае толькі кіраўніцтва і большэвіцкай напорыстасці. Цыркулярамі кіруюць. Работнікі арцелі не памятаюць тэмпа дня, калі-б да іх з'явіўся хто-небудзь з раённых арганізацый.

БАРАНОЎСКІ.

ШЫРЭЙ СОЦСПАБОРНІЦТВА ЗА ПРАВА РАПАРТА VII З'ЕЗДУ СОВЕТАЎ

ЧЫРВОНАЯ КНІГА ІМЯ XI З'ЕЗДА СОВЕТАЎ БССР

На пасяджэнні прэзідыума ЦВК БССР, якое адбылося 29 верасня, было разгледжана пытанне аб вытворчым паходзе імя VII усесаюзнага і XI усебеларускага з'ездаў советаў.

Ухваліўшы ініцыятыву перадавых фабрык, заводаў, калгасаў і саўгасаў па ўключэнню іх у вытворчы паход імя VII усесаюзнага і XI усебеларускага з'ездаў советаў, прэзідыум ЦВК БССР прапанаваў усім РВК і советам шырока прапрацаваць на пленумах райвыканкомаў і советаў, агульных сходах рабочых, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў гэта пытанне і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па ўключэнню ў паход.

Прэзідыум ЦВК рашыў устанавіць **чырвоную кнігу імя XI з'езда советаў БССР.** У гэту кнігу будуць заносіцца па прадстаўленню райвыканкомаў і горсоветаў перадавыя прадпрыемствы соўгасы і калгасы, раёны, советы і асобныя знатныя людзі, якія прыдуць да з'езда з лепшымі колькаснымі і якаснымі паказальнікамі па выкананню планаў за 1934 год.

У СПАБОРНІЦТВА УСТУПІЛА ФАБРЫКА „ДЗВІНА"

(Ад Віцебскага карэспандэнта «Звязды»).

Прапановы рабочых перадавых прадпрыемстваў Масквы і Беларусі аб уключэнні ў вытворчы паход імя VII з'езда советаў, з вялікім здавальненнем спаткалі пролетарыят Віцебшчыны. Разам з рабочым калектывам фабрыкі імя Клары Цэткін, які звярнуўся з пісьмом да ўсіх работных лёгкай прамысловасці БССР аб уключэнні ў паход імя VII з'езда советаў, рабочы калектыў фабрыкі «Дзвіна» таксама ўключыўся ў паход, узяўшы на сябе наступныя канкрэтныя абавязацельствы:

Выканаць верасневы план на 101 проц.

Датэрмінова — к 20 снежня — выканаць промфінплан 1934 г. па ўсіх паказальніках.

Арганізаваць узорную лабараторыю на фабрыцы ў мэтах поўнага ўпчыльнення рабочага дня.

Склікаць у кастрычніку канферэнцыю па ўпчыльненню рабочага дня.

Скласці на 1935 год узорны тэхпромфінплан, уцягнуць у яго распрацоўку шырокія масы рабочых і ІТР фабрыкі.

Да 15 кастрычніка ашкліць усе вокны цэхаў, адраманТаваць дзверы, паравое ацяпленне і вентыляцыю.

Разгарнуць збор рабочых прапаноў у фонд VII з'езда советаў.

Ахапіць у чацвертым квартале тэхвучобай не менш 750 рабочых і 50 зотаўцаў.

Закончыць рамонт і абсталяванне інтэрнатаў да 15 кастрычніка.

К 1 лістапада закончыць рамонт і ўвесці электрычнае асвятленне ў кватэры кадравікоў-ударнікаў. Поўнасцю забяспечыць усіх рабочых апалам, а лепшым ударнікам, апрача таго, перавезці дровы.

Своечасова і высокаякасна закончыць уборку бульбы і гародніны ў прыгараднай гаспадарцы фабрыкі.

Да 1 кастрычніка адкрыць на фабрыцы рабочыя кафэ.

Да 15 кастрычніка закончыць рамонт клубаў.

Не пазней 1 лістапада поўнасцю падрыхтаваць да зімы яслі і дзіцячыя сады.

Радыёфікаваць падшэфную чыгуначную станцыю Лосвіда. Арганізаваць пры станцыі чырвоны куток.

Даламагчы падшэфнаму Далжанскаму сельсовету ў арганізацыі продажу хлеба дзяржаве і арганізацыі масавай работы па ўцягненню працоўных аднаасобнікаў у калгасы.

ЗАРУБЕЖНЫ.

ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСА

(Ад чэрыкаўскага карэспандэнта «Звязды»).

Тав. РЫБАЛАЎ

Заключаючы дагавор на социялістычнае спаборніцтва з перадавым у раёне Мірагашчанскім сельсоветам, некаторыя актывісты **Ушакоўскага**, адставаўшага ў той час, сельсовета не спадзяваліся, што яны выйдуць пераможцамі ў спаборніцтве. Раней яны ні адной кампаніі з поспехам не выконвалі, заўсёды цягнуліся ў хвосце.

Ініцыятар спаборніцтва новы старшыня сельсовета тав. **Рыбалаў** зразумеў, што, не арганізаваўшы мас, не стварыўшы моцнага актыва, ён не выцягне сельсовет з прарыву.

Ва ўсебеларускі конкурс Ушакоўскі сельсовет уключыўся ў першых чыслах мая. Старшыня сельсовета тав. Рыбалаў ва ўсіх новаарганізаваных секцыях, ва ўсіх калгасах і вёсках сельсовета арганізоўвае глыбокую прапрацоўку ўмоў конкурса. Кожнай секцыі, кожнаму калгасу і члену сельсовета ім даюцца канкрэтныя заданні, штодзенна правяраецца выкананне гэтых заданняў, аказваецца дапамога актыву ў правядзенні грамадскай работы.

Хутка сельсовет заваёўвае ў раёне перадавое месца. Дапамаглі ўведзеная здзельшчына, правільна арганізаваная работа ў калгасах, правільная расстаноўка людзей. Сельсовет адным з першых у раёне заканчвае сяўбу з высокімі якаснымі паказальнікамі палявых работ.

Следам за сяўбой аспоўныя сілы калгаснікаў і актыва Рыбалаў пераключае на праполку і на падрыхтоўку да ўборкі.

Да 10 жніўня сельсовет закончыў уборку зернавых, а да 15—лён, прычым да разгортвання ўборкі зернавых і калгасы, і аднаасобнікі сельсовета поўнасцю ўбралі сенажаці.

За 6 дзён — з 3 па 10 жніўня — і калгасы, і аднаасобны сектар сельсовета выканалі гадавы план хлебапаставак, здаўшы дзяржаве высокаякаснае зярно.

Тое, што аднаасобнікі разам з калгасамі выканалі свае планы хлебапаставак з'яўляецца рэзультатам вялікай і глыбокай масавай работы, якая праведзена сельсоветам і аса біста тав. Рыбалавым пры дапамозе актыва сярод аднаасобнікаў.

За датэрміновае і выключна арганізаванае правядзенне хлебапаставак раённай камісіяй па спаборніцтву з Крычаўскім раёнам Ушакоўскаму сельсовету ўручан пераходны сцяг РК КП(б)Б. Апрача таго райком КП(б)Б прэміраваў звыш 20 актывістаў сельсовета.

З поспехам правёўшы ўборку і хлебапастаўкі, т. Рыбалаў не спыняецца на дасягнутым. Ён неадклонна пераключаецца на стварэнне ў калгасах моцнай кармовай базы для жывёлы, а таксама ацяпленне і рамонт кароўнікаў і сынарнікаў. Да 1 верасня сельсовет перавыконвае свой план сіласавання ў колькасці 300 тон.

Сельсовет да 1 верасня закончыў сяўбу азімых і выканаў план зяблева на 100 проц.

Разам з актывам сельсовета 1 секцыі школьнага будаўніцтва сельсовет яшчэ да 15 ліпеня закончыў рамонт школ і да 1 верасня закончыў пабудову на сродкі калгасаў новага будынка для сямігодкі, які мае шэсць раскошных пакояў. Кошт гэтага будынка — 15.000 рублёў.

Сваёй добрасумленнай работай калгаснікі Ушакоўскага сельсовета дабіліся значнага павелічэння вагі працадня. Калі ў калгасе «Штурмавік» у мінулым годзе на працадзень калгасніка прыходзілася 1,5 кгр. зернавых культур, то ў гэтым годзе прыходзіцца каля 5 кгр., а калгаснікі калгасе «Большэвік» атрымліваюць яшчэ больш: па 6 кгр. зернавых замест 2 кілограм у мінулым годзе. Усё гэта выклікала масавае ўступленне ў калгасы аднаасобнікаў.

Пераможцаў конкурса на чале з старшынёй сельсовета **Рыбалавым** па прадстаўленню ЦК КП(б)Б «Правда» занесла на Усесаюзную Чырвоную дошку.

ФОНКАЦ.

СЛУЧЧЫНА У БАРАЦЬБЕ ЗА РАЗВІЦЦЁ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

Советы Случчыны, уключыўшыся ў спаборніцтва советаў па развіццю і паляпшэнню жывёлагадоўлі, па-сапраўднаму ўзяліся за выкананне пастаўленых партыяй і ўрадам задач. Сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў шырока папулярызаваны ўмовы конкурса і мабілізаваны шырокія масы на поўнае іх выкананне. Галоўны ўпор быў зроблен на арганізацыю секцый і дэпутацкіх груп і ўцягненне праз іх шырокага актыва ў практычную работу па развіццю і паляпшэнню жывёлагадоўлі.

У працэсе конкурса па раёну арганізавана 25 жывёлагадоўчых секцый. У конкурс уключылася 89 калгасаў і 126 калгасна-таварных ферм. План камплектавання калгасна-таварных ферм буйнай рагатай жывёлай выканан на 109.7 проц., свінямі — на 102 проц., коньмі — на 141 проц., па закупцы цялят — на 123,8 проц. За 8 месяцаў па раёну агульная колькасць рагатай жывёлы павялічылася на 29,3 проц., свіней — на 44,2 проц., авец—на 29,9 проц. і птушак — на 445,2 проц.

Па калгасах і калгасных фермах своечасова была праведзена работа па арганізацыі прыёму ацёлу і апаросу, па ўкараненню здзельшчыны і падбору людзей для догляду маладняка, а таксама ўстаноўлена кругласутачнае дзяжурства. У рэзультаце захаван маладняк: жарабят — на 100 проц., цялят — на 95,8 проц. і парасят —на 80 проц.

За перыяд конкурса ўсе калгасы набылі аграмаджанае стада. Лепшымі барацьбітамі ў раёне за справу социялістычнай гадоўлі і за першынства ў конкурсе з'яўляюцца **Сярагаўскі сельсовет** на чале з старшынёй сельсовета **Лемешам і Ісернскі** сельсовет з старшынёй **Леанцэвічам.**

У Сярагаўскім сельсавеце, напрыклад, ва ўсіх калгасах аграмаджанае пагалоўе пераведзена на становішча калгасна-таварных ферм. Фермы ўкамплектаваны на 100 проц. Поўнасцю выканан і план злучкі. Усе секцыі советаў і калгасы спаборнічаюць паміж сабой, соцдагавары перыядычна правяраюцца выдзеленымі камісіямі.

Па Ісернскаму сельсовету ва ўсіх калгасах таксама ёсць таварныя фермы. План сіласавання выканан на 106 проц. Секцыі совета працуюць планава і сістэматычна, іх работа правяраецца сельсоветам.

Сярагаўскі і Ісернскі сельсоветы, як перадавыя, раённай конкурснай камісіяй прадстаўлены на ўсебеларускі конкурс спаборніцтва советаў.

Правільнай пастаноўкай работы па догляду маладняка, разгортваннем соцспаборніцтва і ўдарніцтва на фермах, укараненнем здзельшчыны большасць калгасных ферм раёна дабілася станоўчых вынікаў па гадоўлі і захаванню маладняка. Калгас «1 мая», Слуцкага горсовета, напрыклад, давёў пагалоўе на МТФ да 257 штук замест 130 шт. на 1-1 1934 года. З народжаных 109 цялят усе гадуюцца.

Калгас «Случ № 2» давёў свіное пагалоўе на свіна-таварнай ферме з 254 да 351. На ферме ўведзена здзельшчына, арганізаваны дэпутацкія пасты. Ферма спаборнічае з соўгасам «Брапчыны і ідзе ўперадзе. Лепшыя свінаркі Дабралёт Лугіня і Самусевіч Грыпіна правільнай пастаноўкай работы на ферме дабіліся мінімальнага адыходу парасят, які не перавышае 6 проц.

Правядзімы конкурс па жывёлагадоўлі выклікаў буйныя зрухі ў рабоце советаў на гэтым важнейшым участку народнай гаспадаркі, узняў творчы энтузіязм калгаснікаў і павысіў іх адказнасць за справу жывёлагадоўлі.

Дасягнутыя поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі па раёну безумоўна з'яўляюцца яшчэ далёка недастатковымі. Задача партыйных арганізацый, советаў і калгасаў—не супакойвацца на дасягнутых поспехах, працаваць з яшчэ большай энергіяй, каб забяспечыць цёплую сытую зімоўку жывёле.

Нам. старшыні РВК РУСАК.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

САКРАТАРУ БЕШАНКОВІЦКАГА РК КП(б)Б тав. КАЖДАНУ

СТАРШЫНЯ СЕЛЬСОВЕТА ПАТУРАЕ САБАТАЖНІКАМ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА).

Старшыня Свячанскага сельсавета, Бешанковіцкага раёна, **Дзяцель** стаў на адкрыты шлях абароны сабатажнікаў, невыконваючых абавязацельстваў перад дзяржавай.

Усе нядоімкі аднаасобнікаў па хлебапастаўках ён размеркаваў па калгасах сельсовета з разліку па 2 цэнтнеры на калгас. Гэта, па сутнасці кулацкае, мерапрыемства ён правёў пастановай пленума сельсовета. Так, калгас «КІМ» здаў 2 цэнтнеры зярна па абавязацельству аднаасобніка Ткачэнкі з вёскі Касарэвічы. За аднаасобніка Мароза з гэтай-жа вёскі зярно даў калгас імя Сталіна. Усе калгасы сельсовета здавалі па 2 цэнтнеры зярна звыш даведзеных ім планаў.

Дзяцель скрыўлене лінію партыі і ўрада не першы раз. У мінулым годзе, калі ён быў загадчыкам райза, яго судзілі за давядзенне сустрэчных планаў.

ЗАЙЦАЎ.

СТАРШЫНІ БАБРУЙСКАГА РАЙПРОФСОВЕТА т. БЛЮМКІНУ

РУБІНЧЫКУ ЗАКОНЫ НЕ ГІСАНЫ

(ПІСЬМО РАБОЧЫХ)

Па падставе закона аб ахове працы рабочым гарачых кацельных цэхаў даецца месячны адпачынак.

Але дырэктар электрастанцыі Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната Рубінчык не лічыць для сябе абавязковым гэты закон. Ён усім рабочым-кацельшчыкам дае толькі 2-тыднёвы адпачынак.

Трэба прымусіць Рубінчыка выконваць совецкія законы.

Барада,
Шабуня,
Грычанавіч,
Гарэлік.

СТАРШЫНІ ЧЭРВЕНЬСКАГА РВК т. БУШМАНУ

КАЛІ БУДЗЕ АДРАМАНТАВАН МОСТ?

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Па дарозе Чэрвень — Барысаў ва ўрочышчы Новадвор'е, Раваніцкага сельсовета, Чэрвеньскага раёна, ёсць мост праз канаву каля ракі Ушы. Увесь насціл на мосце згніў. Наспраўнасць новадворскага маста для калгаснікаў і аднаасобнікаў Забашэвіцкага, Чарнавіцкага і Лозінскага сельсоветаў з'яўляецца вялікім тормазам у выкананні бульбапаставак.

Чэрвеньскія дарожныя арганізацыі і РВК ведаюць пра гэта, але рамантаваць мост не збіраюцца.

БІРУЛЯ.

САКРАТАРУ МСЦІСЛАЎСКАГА РК КП(б)Б т. ШТЭЙНГАРТУ

ЗЫВАЮЦЬ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Шамаўская няпоўная сярэдняя школа, Мсціслаўскага раёна, будуецца ўжо чатыры гады. Яна не будзе скончана і ў гэтым годзе. Тым часам 12 груп школы туляцца ў адным будынку размерам у 110 кв. метраў (на 1 вучня прыходзіцца 1/4 кв. метра плошчы). Каб прайсці ў настаўніцкую ў часе заняткаў, патрэбна лезці праз акно.

Для сканчэння будаўніцтва не хапае шмат будматэрыялаў (шкла, лесаматэрыялаў і інш.). Старшыня Шамаўскага сельсовета не выплачвае заработкі работным, занятым на будаўніцтве.

НАЗАНКОЎ.

СТАРШЫНІ ПЕТРЫКОЎСКАГА РВК тав. ГРАДУ

ВЫБІТЫЯ ВОКНЫ, ДЗІРАВАЯ СТОЛЬ...

(ПІСЬМО НАСТАЎНІКАЎ)

У бабуйніцкай няпоўнай сярэдняй школе павыбіваны вокны, дзіравая столь, развалены печы.

Да гэтага часу школа не забяспечана дровамі. Настаўнікі не маюць кватэр, не гледзячы на тое, што пры школе ёсць буйынкі, якія можна прыстасаваць пад кватэры.

Аб усім гэтым ведаюць райана і сельсовет, але яны не прымаюць ніякіх мер.

КУДРАВЕЦ І ПАХОМЕНКА.

НАМ ПІШУЦЬ

Як піша калгаснік Кудзямевіч з калгаса «Рассвет», Лістападаўскага сельсовета, (Старобінскі раён), старобінскае паштовае аддзяленне не дасылае падпісчыкам у калгас газеты «Звязда». За верасень з выпісаных 5 экземпляраў ні аднаго не прыслалі.

Студэнт Бокуць М. (Менск, індустрыяльны пенітэхнікум) паведамляе, што конюх Шырко з калгаса «Ударнік» (Уздзенскі раён) з сваякамі збіў кабыліцу аднаасобніка М. Бокуця.

Па гэтай справе выяжджаў участковы міліцыянер Верасневіч, але Шырко запрасіў яго на папойку і Верасневіч справу замазаў.

„ПАДПІСАНА—І З ПЛЕЧ ДАЛОЎ"

Яшчэ 24 чэрвеня «Звязда» змясціла пісьмо ваеннаслужачага тав. Асновіча пад загалоўкам «Калі я атрымаю кватэру», адрасаванае «Звяздой» на імя старшыні менгорсовета тав. Жуковіча.

Двое дзяцей 9 і 15-гадовага ўзросту былога рабочага, зараз ваеннаслужачага т. Асновіча маюць вялікія здольнасці. На гэта ў сваю чаргу звярнуў увагу Наркомасветы і палічыў неабходным даць ім грунтоўную музычную асвету. З гэтай мэтай Наркомасветы перавёў Асновіча на пастаяннае жыхарства ў Менск. Тут яму абяцалі стварыць нармальныя ўмовы для развіцця і выхавання яго дзяцей.

Аднак, становішча зусім адваротнае. Чаго варты хоць-бы такі факт, што Асновіч яшчэ да гэтага часу не атрымаў кватэры.

Два гады Асновіч вандруе з адной кватэры ў другую па сваіх знаёмых, не маючы прытулку (жыў доўгі час у кухні, дзеці спалі на падлозе). Нарэшце, жыў на чардаку ў доме № 13-3 па Ганцлёвай вуліцы, дзе вечная сырасць, цемната.

У кватэры, у якой жыве зараз т. Асновіч, сцены драўляныя, падлога зусім згніла, столь і міжпавярховае перакрыццё з-за пагніўшых бэлек пагражае абвалам і ахвярамі—так адзначана ў даведцы, выданай тэхнікам жыхлемкіраўніцтва т. **Карпілоўскім.**

Два гады Асновіч абівае парогі горсовета і горжылсаюза, але з гэтага нічога не выходзіць. Пастановы ўрада аб стварэнні ўмоў для выхавання юных дараванняў горсовецкіх чыноўнікаў не датычаць.

Такі-ж прыблізна лёс сустрэла і пісьмо тт. Казакевіча, Гаева, Абухава. Яны пісалі аб тым, што:

«У нова-пабудаваным дырэкцыяй пабудовы Вялікага дзяржаўнага тэатра доме па Чычэрынскай 19 сцены ў калідорах пастаўлены дашчатыя, з-за чаго зімой кватэр ацяпліць нельга будзе, уборная і ямы для смецця знаходзяцца каля самых вокан дома, што не дае магчымасці праветрываць кватэры; не зроблена электраправодка, няма кладовай, склепаў, калодзежа. Перакрыццё зроблена без гліняной змазкі, ад чаго пры мыцці падлогі на другім паверсе вада працякае на першы паверх».

Пісьмо гэта «Звяздой» адрасавана таксама на імя старшыні Менгорсовета т. **Жуковіча.**

Роўна праз два тыдні з часу змяшчэння пісьма—28 жніўня — прэзідыум Менгорсовета пастанавіў:

«Абавязаць дырэктара пабудовы Вялікага тэатра не пазней 15 верасня г. г. перадаць 31 жакту дом № 19 па Чычэрынскай вул., загадзя выправіўшы ўсе маючыяся ў доме недаробкі. Жыхлемкіраўніцтву прасачыць за выкананнем гэтага».

Пасля 28-га прайшло 29, 30, 31 жніўня. Прайшло 20 дзён верасня. А дырэктар пабудовы тэатра тав. **Валюкевіч**, якога горсовет абавязаў «прывесці дом у належны парадак», і не думаў выконваць пастанову горсовета, жыхлемкіраўніцтва не бралася «прасачыць за выкананнем». У рэзультаце, як аб гэтым піша жыхар гэтага дома тав. **Пякарчык**, «Дом № 19 па Чычэрынскай вуліцы прадаўжае аставацца без гаспадара. Жакт № 31 лічыць гаспадаром дома дырэкцыю пабудовы тэатра, а дырэкцыя—жакт. А рамонт дома так і не праводзіцца і за яго становішча ніхто не адказвае».

Чаму? Таму, што горсовет, прымаючы сваю пастанову па пісьмах, кіраваўся не інакш як устаноўкай: **«падпісана—і з плеч далоў».**



24 верасня ў Маскве на стадыёне «Дынамо» адбыўся опці дзень спаборніцтваў па бегу з удзелам тэмпіёнаў света ЭЙНО ПУРЕ (Фінляндыя) і ЖУЛЯ ЛЯДУМЕГ (Франція). У бегу на 1.500 метраў першым прыйшоў да фінішу ЖУЛЬ ЛЯДУМЕГ (4 м. 2,3 сек.). У бегу на 3.000 метраў ГРАФІМ ЗНАМЕНСКІ паставіў новы рэкорд (8 м. 40,2 сек.)

НА ЗДЫМКУ: ЖУЛЬ ЛЯДУМЕГ у фініша.

ПОЛЬШЧА АБ УСХОДНІМ ПАКЦЕ

ЖЭНЕВА, 27 верасня. (БЕЛТА). Польскі міністр замежных спраў **Бек** уручыў **Барту** (міністр замеж. спраў Францыі) адказ на працанову аб усходнім пакце. Згодна вестак «Журналь дэ-насіон», Польшча лічыць неабходным удзел Германіі ў пакце, у якім маглі-б нават быць уключаны польска-германскія пагадненні ў форме спецыяльнага артыкула, пацвярджаючага захаванне іх.

Польшча не лічыць магчымым узяць на сябе якія-небудзь абавязацельствы ні ў адносінах Літвы, ні ў адносінах Чэхаславакіі. На думку Польшчы, для захавання міру ў цэнтральнай Еўропе дастаткова лонданскіх пагадненняў аб вызначэнні нападаючага боку.

«Журналь дэ-насіон» думае таксама, што Польшча прынцыпова выказваецца на карысць двухбаковых пагадненняў.

АДКРЭТНЫ ВАЕННА-ПАЛІТЫЧНЫ ДАГАВОР ПАМІЖ ЯПОНІЯЙ І ГЕРМАНІЯЙ

ПАРЫЖ, 27 верасня. (БЕЛТА). **Шарль Сікар**, відны супрацоўнік Пары суар, паведамляе, што ў ніўні Японіяй і Германіяй быў заключан сакрэтны ваенна-палітычны дагавор, згодна якому ўстанаўліваецца тэхнічнае і ваеннае супрацоўніцтва паміж абодвума краінамі. На працягу бліжэйшых 6 месяцаў мяркуецца адпраўка ў Японію 500 авіятараў і інжынераў.

Паводле слоў газеты, Герынг адпраўляе адпраўляў у Токіо 10 адмірных авіяконструктараў міністэрства авіяцыі на чале з вядомым спецыялістам **Мільх**. Германскаму адміралу **Бенке** даручана кіраўніцтва супрацоўніцтва з Японіяй для ўдасканалення марскай артылерыі. Прадстаўнік «І. Г. Фарбен індустры», **Іглер**, арганізуе ў Японіі аддзяленні гэтай фірмы для вырабу атрутных газаў. Фірма Круп атрымала ў Японію свайго прадстаўніка.

— Гэты дагавор—паведамляе далей Сікар — накіраван **супроць Савецкага Саюза**. Апрача таго — піша ён — Розенберг вярбуе бедаваў для дыверсійных акцый на Далёкім Усходзе.

ПРАСОЎВАННЕ ЧАСЦЕЙ КІТАЙСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ТОКІО, 28 верасня. (БЕЛТА) Агенцтва «Сімбунг Рэнго» паведамляе з Ганконга, што часці кітайскай чырвонай арміі пад камандаваннем **Сяо-Ко** прадаўжаюць прасоўванне на злучэнне з чырвонай арміяй **Хо-Луна**. Мяркуецца, што злучыўшыеся часці чырвонай арміі сумесна з чырвонай арміяй Вэньсі ператвораць правінцыі Гуань і Фуджоу ў асноўную базу гэтых аперацый.

У СНК БССР

ПАВЫШЭННЕ ЗАРПЛАТЫ ЗООТЭХНІЧНЫМ І ВЕТЭРЫНАРНЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ, ПРАЦУЮЧЫМ У РАЁНАХ

Совет Народных Камісараў пастанавіў павысіць з 3-га квартала 1934 года зарплату старшым зоатэхнікам і старшым ветурачам раёнаў да 300-400 руб. у месяц, участковым зоатэхнікам і ветурачам да 200—275 р. і ветфельчарам і тэхнікам-жывёлаводам—да 125—180 руб.

Персанальнае вызначэнне ставак зоатэхнічным і ветэрынарным спецыялістам робіцца загадчыкамі раёна, а па соўгасах—дырэктарам соўгаса ў залежнасці ад вытворчага стажу, кваліфікацыі і якасных паказальнікаў у рабоце кожнага спецыяліста.

СНК абавязаў Наркамфін разам з Наркамземам устанавіць фонд заработнай платы для зоатэхнічных і ветэрынарных кадраў да канца 1934 года па кожнаму раёну.

ВОДПУСК ТАВ. ГАЛАДЗЕДУ

СНК БССР пастанавіў прадаставіць старшыні СНК тав. Галадзеду водпуск з 1 кастрычніка па 15 лістапада.

ПАДАРУНКІ ПАДШЭФНАМУ БІРА-БІДЖАНУ

Запалкавы камбінат **«Х Окцябр»** (Рэчыца) адправіў Біра-Біджану адзін вагон запалак.

Завод імя **Варашылава** адпраўляе падшэфнаму калгасу «Чырвоныя сошкі» пажарную машыну.

БІБЛІЯТЭКІ У ДАМАХ КАЛГАСНІКАЎ

Беларускае аб'яднанне культтавараў заказала арцелі «Метраінструмент» 2.000 складных этажэрак для хатніх калгасных бібліятэк. Кожная этажэрка разлічана на ленінскую бібліятэку ў 150 кніг. Кошт этажэркі з бібліятэкай 10—15 руб.

Зімовы сад гомельскага парка культуры і адпачынку.

ЗЛЁТ РАБКОРАЎ ШВЕЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ МЕНСКА

26 верасня ў Доме партактыва адбыўся злёт рабкораў швейнай прамысловасці Менска, скліканы гаркомам КП(б)Б і журналам ЦК «Большэвіцкі друк».

На злёце рабкоры заслухалі даклад тав. Цыпінай аб рабоце журнала «Большэвіцкі друк» і задачах рабкораў у сувязі з падрыхтоўкай да III усебеларускага з'езда рабкораў.

На нарадзе, дзе прысутнічала звыш 100 рабкораў, выступалі і сакратар парткома фабрыкі «8 сакавіка» т. **Сухаліцкі**, з ЦП саюза швейнікаў т. **Фіш** і т.т. **Кузнец, Еслеўскі, Шэрман** і інш.

Нарада прайшла пад лозунгам—за высокую якасць прадукцыі, за поўнае выкананне промфінплана, што будзе лепшым падарункам з'езду рабселькораў.

Р. С.

500 ІЛЬНАТРАПАЛАК СІСТЭМЫ ГАРЛАЧОВА

Бабруйскі і Гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты выпусцілі 500 камплектаў ільнатрапалак сістэмы калгасніка-вынаходцы Гарлачова. Ільнатрапалкі адпраўляюцца ў калгасы.

НАСУСТРАЧ XVII ОКЦЯБРУ

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАПЕЛА

Наркомасветы БССР прыступіў да арганізацыі дзяржаўнай капелы, якая будзе складацца з яўрэйскага і польскага ансамбляў і беларускага хора. Для кіраўніцтва капелай з Масквы запрошан вядомы дырыжэр—хоравед **Барры**.

У рэпертуар капелы ўключаецца твор кампазітара Давідэнка **«На дзесятай вярсце ад сталіцы»**, заключны хор з оперы **«Мейстэрзінгеры»**, Вагнера і творы беларускіх кампазітараў.

Першыя выступленні Беларускай дзяржаўнай капелы адбудуцца ў дні святкавання XVII гадавіны Окцября.

ДАМЫ АДПАЧЫНКУ ДЛЯ ЛЕСАРУБАЎ І СПЛАЎШЧЫКАЎ

Да асенне-зімовых лесазагатовак у раёнах Беларусі арганізуюцца 10 аднадзённых дамоў адпачынку для ўдарнікаў-лесарубаў, возчыкаў і сплаўшчыкаў. Праз гэтыя дамы адпачынку будзе прапушчана каля 3.000 чалавек. Адкрыццё адбудзецца ў дні святкавання XVII-й гадавіны Окцября.

СПАБОРНІЦТВЫ ВАДЗІЦЕЛЯЎ АУТАМАШЫН

ЦС Аўтадора БССР разам з Галоўдартрансам і ЦП саюза шофераў праводзяць у Менску, Віцебску, Магілеве, Бабруйску і Гомелі спаборніцтвы вадзіцеляў аўтамашын на эканомію гаручага.

Мэта спаборніцтваў — на 3-х літрах бензіна пры заданай хуткасці прайсці найбольшую адлегласць пры розных умовах.

Спаборніцтвы адбудуцца 12 кастрычніка ў 2 гадзіны дня на Барысаўскім тракце.

За лепшыя паказальнікі ўстаноўлены наступныя прэміі: для легкавых машын ГАЗ—А—200 і 100 руб., для грузавых паўтаратонных машын ГАЗ—А—225 і 125 руб., для грузавых АМО або ЗІС—5—250 руб. і 150 руб. Для грузавых пяцітонных машын Яраслаўскага завода — 275 руб. і 175 руб.

КУРОЎ.

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

Тэатры БССР у новым сезоне

1935 год будзе пятнаццатым годам існавання **Беларускага першадзяржаўнага тэатра.**

Ад, невялічкай «Беларускай хаткі» праз упартае змаганне з контрреволюцыйнай нацдэмаўшчынай да барацьбы за аўладанне вышынямі мастацтва, нацыянальнага па форме і сацыялістычнага па зместу—вось шлях БДТ-1.

Гісторыя Беларускага тэатра фактычна пачынаецца з заснавання БДТ-1 у 1920 годзе. Да гэтага часу тэатра на Беларусі не было. І тое, што мы зараз маем, з'яўляецца магутным пацвярджэннем трыумфа ленінскай нацыянальнай палітыкі. Тым больш адказная задача стаіць перад БДТ-1, які, як старэйшы тэатр Беларусі, павінен быць вядучым на ўсім тэатральным фронце нашай рэспублікі.

Лета 1934 года БДТ-1 правёў у гастрольнай паездцы па БССР. З 1-га верасня тэатр пачаў работу на сваёй сталай базе, у Менску, адначасова пачаўшы ўсебаковую падрыхтоўку да свайго пятнаццацігадовага юбілея.

Тэатр зараз працуе над двума п'есамі: **«Жыццё кіпіць»** Біль-Белацэркоўскага, якая будзе выпушчана ў кастрычніку і **«Сімфонія гневу»** Шапаленіча, прэм'ера якой намячаецца ў снежні. Наступнай работай БДТ-1 будзе п'еса Галаўчынера **«Валікадушнасць»**, прамірываная на ўсебеларускім конкурсе. Гэтыя тры работы будуць асноўным матэрыялам, над якім тэатр правядзе сваю падрыхтоўку да юбілея.

Адной з важных задач, якія стаяць зараз перад калектывам БДТ-1, з'яўляецца барацьба за далейшы ўздым культуры. Многае зроблена ўжо ў гэтай галіне, дзякуючы рабоце мастацкага кіраўніка тэатра, заслужанага артыста рэспублікі Л. М. Літвінава. Але гэтага яшчэ вельмі мала. Вось чаму для нашага тэатра пытанне культуры формы і мовы, культуры руху і жэсту—пытанні агульныя, над якімі тэатр павінен у гэтым годзе працаваць з большэвіцкай настойлівасцю.

Грунтоўнай праблемай для тэатра з'яўляецца **пытанне падрыхтоўкі кадраў.** Не гледзячы на тое, што БДТ-1, як ні адзін тэатр БССР, захаваў свае асноўныя сілы, пытанне змены набывае вельмі вострую актуальнасць. Тэатр у гэтым годзе разгортвае сваю студыю, робіць новы прыём здольных людзей з гурткоў самадзейнага мастацтва.

Асобна мы выпукляем пытанне абслугоўвання вёскі. Мы лічым, што тэатр павінен наладзіць абслугоўванне соўгасаў і калгасаў не выпадковым матэрыялам, а сур'ёзнымі высокамастацкімі творамі, якія дуць на асноўнай сцэне тэатра.

М. ПАКРОЎСКІ.

Дырэктар Беларускага першага дзяржаўнага тэатра.

Фота Капліцкага

Фізкультхвілінка ў 7 класе 27 яўрэйскай сярэдняй школы у Менску

МЕНСК

УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ VII З'ЕЗДА

28 верасня адбылася нарада старшынь сельсоветаў, калгасаў і парторгаў Менскага раёна ў сувязі з занясеннем раёна на ўсесаюзную чырвоную дошку.

Нарада ўключылася ў вытворчы паход імя VII з'езда советаў, узяўшы на сябе рад канкрэтных самаабавязацельстваў.

⊙ ⊙ ⊙

◆ ПЕРШЫЯ 10 ДУБОВЫХ СТЫЛЬНЫХ БУФЕТАЎ выпусціў завод «Дрэваапрацоўчык». У чацвертым квартале завод будзе выпускаць кожны дзень па 3 буфеты.

◆ АПОШНЯЕ ЛЕТНЕЕ ГУЛЯННЕ ў садзе «Профінтэрн» адбудзецца 30 верасня. Сад рыхтуецца да зімы. На тэрэку будзе арганізован каток для масавага катання.

◆ 150 ЧАЛАВЕК прынята ў фізкультурны тэхнікум у новым навучальным годзе. Заняткі пачнуцца і кастрычніка.

Фота Г. Сокал

У першых числах кастрычніка пры біофаку Беларускага універсітэта адкрываецца па возлагічны музей.

НА ЗДЫМКУ: лось, забіты некалькі дзесяткаў год таму назад у Белавежскай пушчы.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Паводле вестак бюро надвор'я, у Менску тэмпература паветра ноччу з 29 на 30 верасня ад 5 да 8 градусаў, сёння днём—ад 14 да 17 градусаў. Значная воблачнасць да поўнага праяснення сёння днём, без асадкаў. Вятры ад свежых да моцных, паўночна-заходніх і паўночных напрамкаў. Бачнасць добрая.

⊙ ⊙ ⊙

◆ НОВАЯ ЛАЗНЯ адкрываецца 3-га кастрычніка на Серабранцы. Пропускная здольнасць лазні — 120 чалавек у гадзіну. Кошт будаўніцтва—200 тыс. р.

◆ 15 ТОН ГАРБУЗОЎ атрымаў Менгарчгандаль. Гарбузы перадаюцца ў магазіны.

◆ УСЕБЕЛАРУСКІЯ ЛЁГКА-АТЛЕТЫЧНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ «Дынамо» закончыліся. Першынства па ўсіх відах лёгкай атлетыкі з мужчынскіх каманд заняла команда Менска. З жаночых каманд першае месца заняла команда Гомеля і другое — Менска. 16 удзельнікаў спаборніцтваў праіграваны.

Генералы і здрадзе

АГНЕСА СМЕДЛІ

У той час, як трэці корпус чырвонай арміі прымаў асаду ўмацаванага горада Хучана ў паўднёвай Кітаі, Лі Мінь-шу, камандзір 7-га корпуса, прысланага сюды на падмацаванне трэцяму, размышляў аб пакарыстанасці аставацца далей на баку чырвонага камандзіра. І чым больш ён размышляў, тым больш пераконваўся ў сваёй праваце.

Калі некалькі год таму назад ён быў гамінданаўскім генералам у правінцыі Гуансі, жыццё здавалася яму прывабным. Паміма добрай пенсіі, якую ён атрымліваў, ён мог шчэ «падрабляць» на пастаўках абмундзіравання і харчоў. Апрача таго ён атрымліваў вялікі даход ад газіно, а таксама «падарункі» ад гамешчыкаў і багатых купцоў. Жыццё яго цякло весела і бесклапотна, банкеты, азартныя ігры, піяванкі. Пры жаданні можна было ад аднаго генерала да другога, яго суперніка, і кожны таксама «пераход» суліў вялікія выгоды. Ён «заробленыя» грошы можна было ў купляць гонконгскія акцыі і спекуляваць на гонконгскай біржы.

Салдаты! У гаміндаўскіх арміях яны падпарадкаваліся безадмоўна, не адважваліся і пікнуць, і рэдка хто з іх выказваў адольнасць мыслі. І так гэта было аж да сялянскага паўстання на поўдні.

Лі Мінь-шу на чале атрада ў трынаццаць тысяч чалавек быў паслан на поўдзень правінцыі Гуансі для падаўлення сялянскага паўстання. Яго атрад складаўся з сялян беднякоў, батракоў і кулі з правінцый Гуансі або Гуандуна. Апрача таго былі ў атрадзе чыгуначныя і фабрычныя рабочыя. Ганачча пагнала іх у армію—ва ўсякім выпадку большасць з іх. Лі Мінь-шу не бачыў нічога дрэннага ў тым, што ў той час, рэволюцыйны перыяд да 1927 года, салдаты гаварылі аб комунізме, бо комунізм у тую пару быў іменна тым, чым цікавіліся маладыя людзі і просты народ. Ён таксама быў малады і прыхільна адносіўся да комуністаў. Але ён ніколі не забываў, што ён—сын памешчыка. Пакуль комуністы выступалі толькі супроць чужаземцаў, усё было нічога, але калі яны накіравалі сваю зброю супроць памешчыкаў і капіталістаў, гэта ўжо было занадта. Да ўлады прышлі гаміндаўцы, і комуністы былі абвешчаны па-за законам. Лі Мінь-шу забараніў усякую комуністычную дзейнасць сярод сваіх салдат. Ён, вядома, здагадваўся, што комуністычная партыя тайком працуе ў яго атрадзе, але хто з яго салдат быў комуністам, ён не мог дазнацца. Два-тры з падначаленых яму маладых камандзіраў часамі гаварылі з ім у такім духу, што ўнушалі яму некаторае падазрэнне, але ён лічыў іх добрымі хлапцамі і вернымі прыхільнікамі і не хацеў чапаць іх, калі-б нават яны былі комуністамі.

І вось яго паслалі на поўдзень для падаўлення сялянскага паўстання. Ён павінаваўся. Але калі ён выдаў загад войскам змятаць з зямлі паўстаўшыя вёскі, тут адарылася нешта нечаканае! Салдаты падняслі чырвоны сцяг і прама ў вочы яму заявілі, што не наладзіўся яшчэ такі генерал, які прымусіў-бы іх расстрэльваць сялян! Некаторыя з падначаленых яму камандзіраў аказаліся на баку салдат—нават Фан, камандзір палка, адзін з яго старых школьных таварышоў! Замест таго, каб расстрэльваць сялян, салдаты арганізавалі рэволюцыйны камітэт і абвясцілі сябе чырвонымі салдатамі. Да іх у хуткім часе з'явіліся прадстаўнікі чырвонай арміі з Цзянсі, і атрад стаў называцца 7-м корпусам кітайскай чырвонай арміі.

У часе паўстання Лі Мінь-шу хутка прышоў да рашэння, што яго ваенная кар'ера яшчэ не скончана. Як камандзір чырвонай арміі, ён можа заключыць выгодную здзелку з кантонскімі мілітарыстамі, кіраўшымі правінцыямі Гуансі і Гуандун. Калі яму ўдасца, ён пройдзе на іх бок. Не стане-ж ён пярэпець, каб яго цкавалі яго ўласныя салдаты, якія, можа быць, нават калі-небудзь яго расстраляюць!

І ён вынес рашэнне, якое даўно ўжо ў ім наспела. Выступіўшы перад сваімі салдатамі, ён сказаў прамову ў абарону комунізма. І ён амаль верыў у тое, што гаварыў, яго ўзбуджала к гэтаму тое незвычайнае пачуццё, якое ён адчуваў, калі, адкінуўшы ўсю шалуху феадальнага мілітарызма і гандлярства, ён выступаў перад салдатамі, як свабодны чалавек, як рэволюцыянер і камандзір чырвонай арміі.

Салдаты даверыліся яму. Ва ўсякім выпадку—некаторыя. Больш паловы іх былі комуністы і не ўсяму верылі, што выходзіла з языка генерала. Але некаторыя былі наіўныя. Яны бачылі перад сабой чалавека год за трыццаць, здаровага, энергічнага, і ён гаварыў ім аб комунізме. Яны ведалі, што ён—добры камандзір, а яны адчувалі патрэбу ў такіх; хутка ім прыдзецца сустрэцца ў адкрытым баі з гуансійскімі войскамі, якія, бясспрэчна, будуць накіраваны супроць іх. Яны паверацъ яму на слова, што ён—комуніст. Так гэта ці не—час пакажа. А пакуль быў створан ваенны совет з малодшых камандзіраў-комуністаў, якім яны даверялі, і прадстаўнікоў ад салдацкіх камітэтаў, і гэты совет павінен быў падзяліць уладу з іх камандзірам.

Лі Мінь-шу стаў як-бы палоннікам уласных салдат. У свой час ён павёў іх—ці правільней, яны павялі яго—да граніц правінцыі Хунані. Гуандуна і Цзянсі, дзе ім прышлося вытрымаць шмат баёў з мілітарыстамі і памешчыкамі. Раней яны ваявалі нехаця, але калі цяпер яны ішлі ў бой, працяўніку прыходзілася аб сім-тым падумаць.

Але Лі Мінь-шу хутка чартоўскі надакучыла быць комуністычным камандзірам. Яму нярэдка прыходзілася спаць дзе-небудзь на схіле халма або ў сялянскай хаціне,—і заўсёды аднаму. Тут, у гэтых забытых богам мясцах, ты павінен прытварыцца, што любіш жанчыну, калі хочаш, каб яна правяла з табой ноч, і нават у гэтым выпадку ты яшчэ не можаш быць упэўнен, што яна згодзіцца. Грошы пры гэтым не адыгрывалі ніякай ролі, калі-б яны і былі ў цябе, а калі ты ўздумаеш аўладаць жанчынай сілай, то таго і гляджі, што атрымаеш нож у спіну. Сабачае жыццё! Калі вечарам ён лажыўся ў пасцель, ён пераносіўся мыслямі ў публічны дом у Кантоне, да спявачак, на чым абавязку ляжала—аблягчаць жыццё генералаў.

Ён ведаў, што ў радах арміі яго нічога не выражаў. Неяк ён сказаў:

— Калі ты ўпэўнен, што рэволюцыя нічога пам не дасць, то што-ж ты намеран прадпрыняць?

Лі адказваў:

— Мы звернемся к Чэн Чы-тану, які сядзіць у Кантоне, з пэўнай прапановай, і калі ён згодзіцца на нашы ўмовы, мы пяройдзем на яго бок з тымі салдатамі 7-га корпуса, якія пойдуць за намі. Частка іх, зразумела, адмовіцца, але знойдуцца такія, што пойдуць. Я ведаю некаторых камандзіраў, якія пасцлухаюцца мяне. Узяць, к прыкладу, Ван Ю-тана. Я пераўёў яго з радавых у ротныя камандзіры. Раней ён быў проста кулі, а зараз яго становішча зусім другое. Ён комуніст, але я ведаю, што ён не адважыцца аслухацца майго загаду—проста з пачуцця ўдзячнасці. Ён адзін з тых,—каму я больш за ўсё давяраю.

— Калі мы пойдзем на такую штуку, то нас, несумненна, разаб'е трэці корпус.

— Не, гэтага не здарыцца. Ёсць выхад. Калі мы паднімем мяцеж, да нас на дапамогу прыдуць войскі з Хучана, яны ўдараць трэцяму корпусу ў тыл... Або-ж мы патрэбуем, каб нас паслалі ў раён Мейцяна на поўнач ад Гуандуна весці там партызанскую вайну. А пасля прыходу туды мы пяройдзем на бок кантонскіх войск.

Выслухаўшы план Лі Мінь-шу, Фан заявіў, што ён павінен усё абдумаць раней, чым рашыцца. Але Лі не стаў чакаць. Свае планы ён паведаміў другім, каму ён давяраў, і адной з такіх даверанных асоб быў ротны камандзір Ван Ю-тан. Лі заявіў Вану, што ён назначыць яго батальённым камандзірам, калі яго план ажыццёвіцца; ён нават рашыў паслаць Вана з пісьмом да Чэн Чы-тана, віднага кантонскага мілітарыста. Да рэчы, думаў ён, Ван выбран дэлегатам на з'езд советаў у Жуйцзіне. З совецкай тэрыторыі ён можа накіравацца на поўдзень у Гуандун, а не ў Жуйцзінь.

Але прайшло два-тры дні, і Лі Мінь-шу пачаў заўважаць, што за ім сочаць дзень і ноч. Яго ўсюды суправаджала ахова з пяці чалавек. Пен Дэ-хуай паведаміў яго, што з прычыны небяспекі для жыцця камандзіраў у сучасны момант, пакуль вядзецца асада Хучана, вышэйшым камандзірам дасецца спецыяльная ахова—узброеныя салдаты, апранутыя ў штацкае.

Дзве ночы пасля гэтага Лі не закрываў вачэй. Падазрэнне закрадвалася ў яго супроць свайго прыяцеля Фана, а таксама Вана. Ван ужо паехаў у Жуйцзінь, захапіўшы з сабой каштоўнае пісьмо Лі да генерала Чэн Чы-тана! Якая няўдзячнасць з боку гэтых людзей! Старая кітайская добрачыннасць адданасці сваім прыяцелям і добрачынцам піне, а з ёю заціне і Кітай, як нацыя!

Усю ноч напралет прыслухоўваўся Лі да крокаў салдат, ахоўваючых яго палатку. Тры з іх, відаць, спалі, а два вартавалі. Нарэшце, толькі адзін астаўся на пасту. Прышоў час,—думаў Лі,—калі ён не можа ні на кога больш палажыцца, і што-б там ні здарылася, але ён павінен вырвацца з рук яго асабістай аховы і ўцячы ў Кантон.

На другую ноч Лі зноў ляжаў з адкрытымі вачыма, прыслухоўваючыся. Гадзіны ішлі марудна, быццам на свінцовых нагах. Частка яго аховы ўжо спала. На світанні Лі асцярожна ўсё агледзеў і пераканаўся, што заснулі ўсе пяцёра, прытым два спалі седзячы, апёршыся спіной аб дрэва.

Вышаўшы з палаткі, Лі ціха прайшоў міма аховы і хутка падаўся ўперад, схаваўшыся ў цемры.

Раптам ззаду раздаўся вокрык: «Стой!» Набраўшыся духу, ён запаліў электрычны ліхтарык і ўбачыў непадалёку двух вартавых. Сярдзітым тонам Лі заявіў ім, што ён чырвоны камандзір і ідзе па неадкладнай справе.

— Пароль!—патрэбавалі вартавыя.

Пароля Лі не ведаў. Ён дзерзка адказаў, што яму, як камандзіру, пароль не патрэбен, калі патрабуецца выйсці па справе. Але вартавыя спакойна заявілі, што без пароля яны не дазволяць яму рушыцца з месца.

Не жадаючы больш даваць тлумачэнні, Лі, сярдзіта лаючыся, прашоў міма вартавых. Адзін з іх крыкнуў уздагон: «Стой!», але Лі не звярнуў ніякай увагі. Раздаўся стрэл, ён пахіснуўся і ўпаў, ранены ў бок. Нейкія цёмныя фігуры нахіліліся над ім. Потым пачуўся тупат бітучых ног, і новыя фігуры нахіліліся над ім. Яго падняслі і кудысці панеслі.

Потым былі арыштаваны трое прыяцеляў Лі Мінь-шу.

***

Так закончылася адна з многіх спроб узарваць чырвоную армію знутры—спроб, не раз цярпеўшых няўдачу: масы і чырвоная армія ўсвоілі другія добрачыннасці, памімо адданасці прыяцелям і добрачынцам.



ШАХМАТЫ і ШАШКІ

Пад рэдакцыяй А. А. КАСПЕРСКАГА.

Шашачныя этюды Я. Х. Гордзіна (Бабруйск).

(Спецыяльна для газеты „Звязда")



Белыя дамні: a5, d8, b2 (3).
Чорныя: дамка b8, простыя d4 і e3 (3).
Белыя пачынаюць і выйграюць.

Вучыцеся шахматнай тэорыі

Становішча пасля 12 ходу белых с партыі **Алёхін—Ласкер** (Цюрых 1934 г.).



Такое становішча здарылася пасля хад ў.

Бел **Алёхін**—чорныя **Ласкер.**

1. d2—d4, d7—d5; 2. c2—c4, e7—e6; 3. Kg1—f3, Kg8—f6; 4. Kb1—c3, Cf8—e7; 5. Ce1—g5, Kb8—d7; 6. e2—e3. 0—0; 7. Da1—c1, c7—c6; 8. Cf1—d3' d5:c4; 9. Cd3:c4, Kf6—d5; 10. Cg5:e7, Фd8:e7; 11. Kc3—e4, Kd5—f6; 12. Ke4—g3 тут трэба была іграць Фb1+ і пасля размена фігур іграць большменш выраўнівалася. Ласкер жа памылкова выграў 12. e6—e5? Паследавала: 13. 0—0!, e5:d4; 14. Kg3—f5, Фe7—d8; 15. Kf3:d4, Kd7—e5. 16. Cc4—b3, Cc8:f5; 17. Kd4:f5; Ласкер у далейшым не змог справіцца з труднасцямі і партыю прайграў.

МЕНСКІЯ ГАРАДСКІЯ ЧЭМПІЯНАТЫ

Па шахматах ігры падыходзіць к канцу. У лепшых шансах **Камянецкі** (+5,5 з 7), **Жыткевіч** (+6 з 8), **Касперскі** (+5 з 7). Далей ідуць **Прупес** (+5,5 з 9), **Мейлес** (+4,5 з 7), **Кацнельсон** (+4,5 з 8). **Зісман** (+4 з 8).

Па шашках перамога не відавочна. Майстар **Гардон**, прайграўшы маладому іграку Абрамаву, мае +7 з 8 **Ліхадзіеўскі** +7 з 8. **Нікалаеў** +4 з 5, **Абрамаў** +5,5 з 9, **Ленах і Багамольнікаў** па +5 з 9.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ГК КП(б)Б паведамляе ўсіх сакратароў парткомаў, парторгаў і прапагандыстаў партыйнай і комсамольскай сеткі, што чарговыя заняткі ў сетцы партыйнай і комсамольскай асветы — з 3 кастрычніка прысвячаюцца прапагандоўцы матэрыялаў аб 70-годдзі 1-га Інтэрнацыянала.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

Гукавы кіно-тэатр Чырвоная Зорка — НОВАЯ ПРАГРАМА. У фай з—канцэрт. эдда.

ГУКАВЫ кіно-тэатр „Пролетарый" — Маставі гукавы фільм „ПРАСПЕРЫЦІ". Звыш праг. Муз-джаз.

Кіно „Інтэрнацыянал" — НОВАЯ ПРАГРАМА. Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно

Кіно „СПАРТАК" — Ад 29 верасня. Замежны фільм НА СЁМЫМ НЕБЕ. Камедыя ў 7 частках. У галоўнай ролі Гарольд Лойд. У праграме—кіно-хроніка. ШТОДЗЕННА 5 СЕАНСАЎ. КАСА—з 4 гадзін дня.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁПЕРАКЛІЧКА АБ ХОДЗЕ УСЕСАЮЗНАГА ПЕРАПІСУ БІБЛІЯТЭК

Кіраўніцтва народна-гаспадарчага ўліку БССР, Наркомасветы і ЦСПСБ праводзяць у 1-й гадзіне ночы з 2 на 3 кастрычніка радыё-перакліч аб ходзе Усесаюзнага перапісу бібліятэк.

На радыё-вузлы павінны з'явіцца к гэтаму часу старшыні райпрофсаветаў, упаўнаважаныя ЦСПСБ, загадчыкі раённых бібліятэк.

Нач. КНГУ БССР ВЛАДЗІМІРСКІ.
Наркомасветы ЧАРНУШЭВІЧ.
Старшыня ЦСПСБ КАВАЛЬЧУК.

Друкарні „Звязда" ПАТРЭБНЫ:

1. Электра-мантёр ведаючы слесарную работу.
2. Прыёмшчыкі на ратацыйнай машыне.
3. Вучні-лінатыпісты.

Зварачацца: Совецкая, 63. 2-гі паверх да дырэктара.

Менск, друкарня «Звязды»

Выпускаючы—А. КРУЧКОЎ, ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж—Н. ПЕРАКЛАДНЁЎ, ст. стэрэатыпер—Е. КАГАН, ст. друкар—З. РУБІН.

Уп. Галоўлітбела № Л—5579.